МЯСКВА, 1. У сувязі з пераходам з прафработы на іншую працу т. т. Томскага, старшыні, Міхайлава і Угарава, чепнаў УсеЦСПС, другі пле ум УсеЦСПС пастанавіў аспабаніць іх ад займаемае працы і скласьці сакратарыят з 5 асоб—т.т. Дагадава, Якупава, Швэрніка, Вэйнбэрга і Яўрэінава

ЗЬВЯЗДА

№ 123 (3231) Нядзеля, 2-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 33
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

МАЗЫР. (Наш. кар.). 28 мая перайшоў на электраэнэргію цэлы рад прадпрыемстваў Мазырскага камунальнага трэсту. Пераход на электраэнэргію дасьць магчымасьць узьняць вытворчасьць працы і патаніць сабекошт прадукцыі

Выбары у Ангельскі парлямант

Паражэньне цьвёрдалобай рэакцыі

Магчыма стварэньне „рабочага", ці „рабоча"-лібэральнага ўраду

Кампартыя—адзіная абаронца інтарэсаў пралетарыяту

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

ЛЁНДАН, 1. Вынікі выбараў да дзесяці гадз. увеч. 31 мая былі наступныя: кансэрватары—254, рабочая партыя—287, лібэралы—52, беспартыйныя 7. У округах, па якіх вынікаў яшчэ няма, рабочая партыя мае 11 мандатаў.

* * *

Жорсткае паражэньне кансэрватыўнай партыі, ваяўнічай і тупарэкцыйнай «цьвёрдалобай» партыі брытанскага імпэрыялізму, перамога рабочай, больш дакладней кажучы, ілжэрабочай сацыял - імпэрыялістычнай партыі—такі вынік ангельскіх выбараў.

«Выбарны хістальнік пахіснуўся»—заспакойвае сябе містэр Бальдвін, спрабуючы надаць свайму паражэньню часовы, пераходны характар.

Не, пахіснуўся не хістальнік. Старая Англія, якая маладзілася, пахіснулася. Ні ў тым, зразумела, сэнсе, што перамога Макдональда азначае патрасеньне ўстояў капіталістычнай Англіі. Ні ў якім выпадку. А ў тым сэнсе, што ў апошнія гады эканамічныя асновы брытанскага імпэрыялізму ўсё больш расхіставіліся і разам са спаўзаньнем матар'яльнага фундаманту стала хістацца ўся складанейшая вежавая палітычная надбудова. І калі надышоў дзень выбараў пахіснуўся і вянец яе—старая, гордая кансэрватыўная партыя.

Пад ударамі эканамічнага крызысу паслабла сувязь паміж буржуазіяй і кансэрватыўнымі пластамі рабочае клясы. Цяжкае, хранічнае беспрацоўе мёртвым грузам ціснула на выбары, прыціснула кансэрватыўную партыю. Двухмільённая армія беспрацоўных, разам з сем'ямі—4-5 мільённае рабочае насельніцтва, у працягу некалькі год пазбаўленае выстарчальных сродкаў да існаваньня—гэтыя факты зразумелы нават самаму адсталаму рабочаму выбаршчыку—не маглі ня мець уплыву на вынікі выбараў.

Перад тварам эканамічнага крызысу кансэрватыўная партыя выявіла сваю поўную пасыўнасьць, тупы розум, зьбянтэжанасьць. Нават найбольш актыўны з членаў кансэрватыўнага ўраду Чэрчыль умее толькі скардзіцца на злы лёс.

«Гэты злы дваццаты век, пазбавіў нас многіх пераваг, якія мы мелі у адносінах да другіх краін. Ен стварае для нас новы непакой, ускладае на нас вялікую адказнасьць: ён пагражае нам, калі мы не справімся са свімі задачамі, заняпадам, крушэньнем» (з прамовы па радыё 30 красавіка).

Але ў другой прамове ён дасканала ілюструе, як цьвёрдалобыя кіраўнікі Англіі разумеюць сваё пачуцьцё адказнасьці. За два тыдні да выбараў, ён з поўнай пагардаю адхіляе цьверджаньне ў тым, што беспрацоўе—буйнейшая праблема выбарнай кампаніі.

«Нельга дапусьціць,—заяўляе ён,—што ўвесь лёс брытэнскай імпэрыі, усе асновы нашага сучаснага цывілізаванага грамадзтва павінны быць пастаўлены ў залежнасьць ад праблемы лячэньня тэй невялікай часткі нашых грамадзян, якія ня ў стане знайсьці сабе работу».

Ён зло гаворыць:

«Гэта дурацкая спроба».

Але вось на праверку вышла, што гэтай «дурацкай спробы» кансэрватары ня вытрымалі. Мільёны выбаршчыкаў пайшлі да урнаў з думкаю аб тым, што кансэрватары ня толькі нічога не зрабілі для барацьбы з беспрацоўем, але павялічылі яе сабатажам гандлю з СССР, пагоршылі становішча беспрацоўных скарачэньнем дапамогі.

Не забылі таксама мільёны выбаршчыкаў «дасягненьняў» кансэрватараў у галіне замежнай палітыкі, сабатаваньне Чэмбэрленам малейшых крокаў у галіне разбраеньня, якое мае ў сябе вялізнія небясьпекі для справы міру, патаёмную ваенную згоду з Францыяй, надзвычайнае абастрэньне адносін з магутнымі ПАЗШ—усё гэта выклікала глыбокі непакой і нездавальненьне выбаршчыкаў, выклікала іх адыход ад кансэрватыўнай партыі.

У псыхіцы мас адбываецца эвалюцыя, але яна далёка яшчэ ня скончана.

Аднак, сацыяльныя буры, што насьпяваюць, будуць гэтыя ілюзіі бязьлітасна расьсейваць. Моцная палітычная стабілізацыя ў Англіі з гэтага часу немагчыма. У выніку створанага парлямэнту і суадносін сіл, да ўлады напэўна, прыдзе «рабочы» ці «рабоча-лібэральны» урад. Ён наогул будзе з невялікімі адхіленьнямі праводзіць генэральную лінію кансэрватыўнага ўраду. «Новым» у палітыцы такога ўраду могуць быць дробныя рэформы ў галіне грамадзкіх работ і дапамогі для беспрацоўных, у падатковай галіне, менш агрэсыўны курс у адносінах да ПАЗШ, аднаўленьне дыплёматычных зносін з СССР, сякія-такія ілжэпацыфісцкія гэсты.

Але крызысу брытанскага імпэрыялізму «рабочаму» ці «рабоча-лібэральнаму» ураду ня вырашыць. Макданальдаўскі ўрад будзе залежаць ад міласьці лібэральнай буржуазіі. Калі ён акажыцца прымушаным зрабіць лішнюю ўступку рабочай клясе, каб утрымаць пад сваім уплывам пралетарыят, яго лібэральныя саюзьнікі перакінуцца ў бок кансэрватараў і няшчасны, бездапаможны «рабочы» ўрад паляціць таксама як ён паляцеў у 1924 годзе.

Новыя ўрокі пойдуць на крысьць ангельскаму пралетарыяту. Усё больш шырокія пласты яго на палітычнай практыцы пераканаюцца, што адзінай абаронцай яго інтарэсаў зьяўляецца кампартыя, якая правяла сваю агітацыйна-выбарную кампанію пад лёзунгам: «кляса супроць клясы».

(«ПРАВДА»).

Увесь сьвет сочыць за выбарамі ў Англіі

ЛЁНДАН, 31. Камэнтуючы першыя лічбы падліку галасоў «Таймс» суха канстатуе, што няма ніякіх аданакаў уваскрашэньня лібэральнае партыі. Многія паражэньні кансэрватараў газэта тлумачыць тактыкай лібэралаў, якія амаль усюды высунулі ўласных кандыдатаў. Газэта звачае ўвагу на тую акалічнасьць, што ўвесь сьвет сачыць за ангельскімі выбарамі і піша:

«Эўрапэйскі кантынэнт з нецярпліваcьцю чакае, які ўрад будзе абраны ў Англіі. Магчыма, што марядны тэмп сякіх-такіх перагавораў тлумачыцца часткова і тым, што ад надыходзячай зьмены міністраў у Англіі чакаюць лепшых умоў у тым, або іншым кірунку.

Уся Індыя чакае перамены падзей. Тое самае можна сказаць і пра Эгіпэт, дзе пад абалонкай супакою тояцца рыхтаваньні да новай палітычнай актыўнасьці. Тое самае і ў Кітаі, дзе грамадзянская вайна за спадчыну, якую вядуць паміж сабою генэралы, па крысе нібы адступае перад урадам, які вдолеч весьці справы з іншымі нацыямі».

Па думцы «Морнінг Пост», першыя вынікі служаць довадам таго, што лібэралы—лепшыя саюзьнікі рабочае партыі.

Газэта «Івнінг Стандарт», камэнтуючы вынікі ангельскіх выбараў, піша:

«Хаця пытаньні замежнай палітыкі не адыгрываюць важнай ролі ў ангельскіх выбарах, тым ня менш, аднэй з прычын, што выклікала правал кансэрватараў, было бязумоўна пачуцьцё нездаваленьня замежнай палітыкай ураду».

„Баявое хрышчэньне" польскага ваенна марскога флёту

БЭРЛІН, 31. «Форвэрц» ад 24 мая 1929 г. паведамляе наступнае:

«21-га мая г. г. насельніцтва польскага порту Гдыні і ваколіц было спалохана паведамленьнем, што недалёка ад Пуцыга выплыла міна. Гэта міна засталася, нібы, з часоў імпэрыялістычнае вайны і выплыла пасьля буры. Польскія марскія ўлады зараз-жа выдалі загад аб спыненьні ўсякага мараходства ля берагоў Гдыні, а польскі ваенны флёт атрымаў загад міну абясшкодзіць.



З дадатковых даных варшаўскага агэнцтва друку відаць, што польскае марское камандаваньне пераканалася ў тым, што паліка была выклікана ня мінай, а... звычайным буйком.

На раённых партканфэрэнцыях у Менску

Адкрылася Фрунзаўская райпартканфэрэнцыя

Учора ў клюбе імя К. Маркса адкрылася II Фрунзаўская раённая партканфэрэнцыя.

Адкрываючы канфэрэнцыю тав. Гурэвіч—сакратар Фрунзаўскага РК КП(б)Б у сваёй уступнай прамове паказаў на тыя задачы, якія павінны вырашыць канфэрэнцыя.

— Мы сабраліся на канфэрэнцыю для таго,—кажа тав. **Гурэвіч**,—каб падвесьці вынікі работы Фрунзаўскай арганізацыі КП(б)Б і раённага камітэту на працягу апошніх шэсьці месяцаў.

— Наша арганізацыя падыйшла да сваёй канфэрэнцыі пад знакам адзінства і згуртаванасьці сваіх радоў. Арганізацыя аказала самы рашучы бязьлітасны аднор правым апартуністым і прымірэнцам.

Не паслабляючы барацьбы з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму арганізацыя накіравала ўсю сваю ўвагу на барацьбу з канкрэтнымі праяўленьнямі правага ўхілу і прымірэнцтва ў штодзённай практычнай рабоце.

***

Ад імя аб'яднанай дэлегацыі ячэек заводаў «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», фабрыкі Меншвэй і 1 друкарні тав. **Затурэнскі** прапануе абрацьпрэзыдыум у ліку 35 чалавек. У прэзыдыум абіраюцца: т. т. **Гамарнік, Калнін, Затонскі, Дамброўскі, Васілевіч, Чарвякоў, Славінскі, Тамашэўскі, Цэнцыпер, Жуковіч, Гурэвіч, Грушнеўскі, Клімчук, Матылева, Чарнецкі, Сянкевіч, Розін, Затурэнскі, Заянчкоўскі** (рабочы заводу «Камунар»), **Лембэрг, Штаркман, Пінская** (работніца 1 друкарні), **Клімавіцкі** рабочы заводу «Дрэваапрацоўшчык»), **Кінэр, Грыб, Канатопскі** (рабочы-будаўнік), **Пятрушын, Ледвіч, Гайдук, Заранкіна** (работніца-тэкстыльшчыца), **Жардзцкі** (рабочы шпалернай фабрыкі), **Левін, Крохмаль** (вайсковы), **Аверын** (вайсковы), **Хайкоў** (вайсковы).

Дадаткова ў прэзыдыум абіраюцца т. т. **Малаў** (хлебазавод), **Корф** (ЦВК), **Бачароў** (вайсковы).

Канфэрэнцыя зацьвердзіла наступны парадак дня:

1) Даклад АК КП(б)Б. 2) Справаздача РК КП(б)Б. 3) Справаздача рэвізійнай камісіі. 4) Судаклад РК ЛКСМБ. 5) Выбары РК, рэвізійнай камісіі і РКК.

***

Потым канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **Тамашэўскага** аб рабоце АК КП(б)Б і задачах партарганізацыі.

ПРЫВІТАНЬНЕ „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

Ад Фрунзаўскай раённай партканфэрэнцыі

Бальшавіцкай «Зьвязьдзе»—цэнтральнаму органу ЦК КП(б)Б, настойліваму праваднику Ленінскай лініі нашай партыі ва ўсіх галінах сацыялістычнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, пабальшавіцку выхоўваючаму шырокія колы нашай партыі ў барацьбе з ўсялякімі ўхіламі ад Ленінскай лініі, вернаму праваднику нацыянальнай палітыкі і беларусізацыі ад Фрунзаўсчай Райпартарганізацыі—шчырае прывітаньне.

Канфэрэнцыя ад імя ўсей арганізацыі заяўляе, што яна прыложыць усе сілы да таго, каб «Зьвязда» стала яшчэ больш масавай, каб яна яшчэ больш унядрала Ленінскія ідэі ў шырокія партыйныя і рабочыя масы.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БАЛЬШАВІЦКАЯ «ЗЬВЯЗДА».

Адкрыцьце 2-ой раённай канфэрэнцыі Кастрычнікаўскай партарганізацыі

Учора ўвечары адкрылася 2-я раённая канфэрэнцыя Кастрычнікаўскай партыйнай арганізацыі.

Сакратар Кастрычнікаўскага райкому, **т. Конюхаў**, у кароткім уступным слове, спыніўся на тых абставінах, у якіх працавала кастрычнікаўская партарганізацыя ад часу 1-ай раённай канфэрэнцыі.

Уся наша ўвага,—кажа тав. Конюхаў,—была зьвернута на выкананьне задач, якія паставіў перад партыяй XII зьезд КП(б)Б. Мы правялі і вядзем рашучую барацьбу з ухіламі ад ленінскай лініі партыі і з прымірэнцтвам. Наша арганізацыя прыйшла да 2-й сваёй канфэрэнцыі цесна згуртаванай навакол ленінскай палітыкі партыі.

Пад гучныя воплескі дэлегаты канфэрэнцыі абіраюць у прэзыдыум т. т. **Гамарніка, Затонскага, Гэрасімава, Васілевіча, Галадзеда, Славінскага, Стасевіча, Конюхава, Піляра, Шкірыча, Капаевіча, Галубава, Шнэйдэра, Мілеўскага, Штэймана, Сагаловіча, Данілевіча, Карася, Курана, Вішнеўскую, Эпштэйна, Дзімітровіча, Раманава, Іванова, Лісоўскага, Курана, Абрамовіча** і інш.

У сакратарыят канфэрэнцыі абрана 5 чал., у мандатную камісію—5 чал.

У ганаровы прэзыдыум пад доўгія гучныя воплескі абіраюцца т. т. **Сталін, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Арджанікідзе, Рудзутак і Куйбышаў.**

Потым канфэрэнцыя прыступіла да парадку дня сваёй работы.

Учора партканфэрэнцыя заслухала даклад т. **Славінскага** аб чарговых задачах партарганізацыі Менскай акругі і справаздачу Кастрычнікаўскага Раённага камітэту партыі, з якою выступіў тав. Конюхаў.

Сёньня раніцай пачнуцца спрэчкі па абодвых дакладах.

Забастоўка с.-г.рабочых у Славакіі

«Стабілізаваная» капіталістычная Чэхаславакія перажывае трывожныя дні. У заходняй Славакіі адбываецца забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых, якія змагаюцца за павялічэньне заработнае платы, паленшаньне ўмоў працы і скарачэньне рабочага дня. Забастоўка, выбухнуўшы спачатку ў округах Врадле, Нэйтра і Галанта, зараз ахапіла амаль увесь захад і поўдзень Славакіі. У округах Врадле Трынау, Камэрн, Нэйжэйжэль і Галанта забастоўкай ахоплены ўсе сто процантаў сельска-гаспадарчага пралетарыяту. Усяго бастуе каля 25.000 чалавек.

Але ня толькі лік бастуючых, ня толькі ўпартасьць рабочых і іх энтузіязм важны ў падзеях, што разгарнуліся ў Славакіі. Зварачаюць на сябе ўвагу нячуваныя паводзіны рэфармістых, якія выступаюць у ролі ня толькі актыўных штрэйкбрэхераў, але і сапраўдных душыцеляў рабочае клясы. Рэфармістыя прыбегалі да досыць звычайнага прыёму, які ня раз з посьпехам ужываўся ў задушэньні забастовак іх братавымі ў Нямеччыне і ў іншых краінах. Рэфармісцкі прафсаюз хутка пасьля абвяшчэньня забастоўкі, заклічыў «ад імя рабочых» калектыўны дагавор з прадпрыемцамі. Які-ж гэты калектыўны дагавор—лепш за ўсё гаворыць тое, што рабочыя, даведаўшыся аб яго зьместе, на другі-ж дзень тысячамі пакідалі работу. Лік бастуючых за некалькі дзён узрос у два разы. Але руху ўжо была нанесена непаправімая перашкода. Спасылаючыся на дагавор, улады пасьпяшыліся абвясьціць забастоўку «незаконнай» і пачалі прасьледваць бастуючых.

Забастоўка праходзіць у надзвычайна цяжкіх умовах. Раён забастоўкі нагадвае тэатр ваеннае чыпнасьці. Усюды атрады узброеных стражнікаў і конная жандармэрыя. Сходы і мітынгі забаронены. Кіраўнікі нізавых арганізацый прафсаюзаў арыштоўваюцца групамі. Зборышчы больш двух чалавек на вуліцах сёл і гаралоў разганяюцца, як «злачынныя зборышчы». На сьценах дамоў расклеены плякаты, у якіх улады апіраючыся на чынпасьць рэфармістых, прапануюць зараз-жа стаць на работу, пагражаючы бастуючым ўсялякімі карамі. Адначасова ў тысячах экзэмпляраў распаўсюджваецца лістоўка, пад якой красуюцца подпісы вобласных камітэтаў сацыял-дэмакратычнай, аграрнай і клерыкальнай партый. Лістоўка, зварачаючыся «да грамадзкіх пачуцьцяў» рабочых, заклікае іх прыняць калектыўны дагавор і неадкладна стаць на работу, бо працяг забастоўкі ў гарачы час сельска-гаспадарчых работ азначае ўдар па нацыянальных інтарэсах.

Паводзіны рэфармістых ў славацкай забастоўцы багаты небясьпечнае для ўсяе рабочае клясы Чэхаславакіі. Як правільна паказвае ў сваёй водзьве да бастуючых Цэнтральны камітэт чэхаславацкай камуністычнай партыі, гэта—шырока задуманая і плянамерна апрацоўваная спроба пазбавіць рабочую клясу правоў на арганізацыю і забастоўку. І сапраўды, досыць праўленьню якога-небудзь прафэсыянальнага саюзу заключыць заведама несправядлівую і няпрыемлемую для бастуючых згоду з прадпрыемцамі, каб забастоўка была абвешчана па-за законам, і на бастуючых абрушыўся кулак адзінага фронту прадпрыемцаў, рэфармістых і дзяржаўнае ўлады.

Але рэфармістым не ўдасьцца так лёгка задушыць забастоўку сельска-гаспадарчых рабочых Славакіі. Вельмі вялікае абурэньне рабочых і глыбока заваёвацць лёзунгі растлумачальнай кампаніі камуністычнае партыі, каб рэфармістым удалося атрымаць лёгкую перамогу.

А. О.

Забастоўка 25000 рабочых тутунёвай прамысловасьці ў Баўгарыі

МАСКВА, 1. Апублікавана адозва выканбюро Прафінтэрну да рабочае клясы ўсіх краін і да рабочых Баўгарыі.

У Баўгарыі забастоўка рабочых тутунёвай прамысловасьці ператварылася ва ўсеагульную забастоўку рабочых тутунёвай прамысловасьці,—гаворыцца ў адозьве. 25.000 рабочых тутунёвай прамысловасьці абвясьцілі ўсеагульную забастоўку. Рабочыя тутунёвай прамысловасьці перайшлі ў наступленьне. Усеагульная забастоўка рабочых тутунёвай прамысловасьці выбухнула ў прамысловасьці баўгарскае народнае гаспадаркі і паносіць таму цяжкі ўдар фашысцкаму рэжыму.

Баўгарскія рабочыя! Значэньне забастоўкі рабочых тутунёвай прамысловасьці далёка выходзіць за межы барацьбы за зарплату! Пры вашым падтрыманьні яна здолее вырасьці ў барацьбу ўсяго баўгарскага пралетарыяту і бяднейшга сялянства з фашысцкім рэжымам!

Рабочыя ўсіх краін! Узьвімайце свой голас пратэсту супроць баўгарскіх фашысцкіх катаў, супроць прыгнятальнікаў баўгарскага пралетарыяту!

Польскія сацыял-фашысты расстрэльваюць рабочых

Сялянства Віленшчыны харчуецца травой

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА З РАБОЧАЙ ДЭЛЕГАЦЫЯЙ

ВАРШАВА, 31. Камфракцыя сойму апублікавала паведамленьне аб крывавай расправе, што ўчынілі 30-га мая пэпэсаўскія дружынікі над рабочай дэлегацыяй, якая прыехала на зьезд прафсаюзаў.

Камфракцыя канстатуе, што старшыня цэнтральнай камісіі прафсаюзаў, пэпэсавец Жулаўскі загадаў страляць у дэлегацыю. У выніку чацьвёра параненых, адзін з іх дзяцка.

***

ВАРШАВА, 1. Як паведамляюць з Львова, уланамі быў забіты прахожы Мікалай Зейдель в прычыны звычайных спрэчак.

***

ВАРШАВА, 1. Супрацоўнік старостваў Улацлаўску забіў стрэлам в рэвальвэру на вуліцы рабочага Крашэўскага, які нібы абразіў чыноўніка.

ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ

ВАРШАВА, 30. Пачалася забастоўка ў гуце «Нёман». Забастоўка выклікана нерэгулярнаю выплатаю зарплаты.

У Варшаве пачалася забастоўка камашнікаў, якія патрабуюць ад 10 да 30 проц. надбаўкі да зарплаты; выплаты зарплаты гатоўкаю, а не квіткамі; прыманьня і звальненьня рабочых выключна праз саюз.

У другой вайсковай фабрыцы зброі ў Варшаве загадчык фабрыкі Ленартовіч, былы палкоўнік, неаднокраць лаў рабочых в апошніх слоў. Выведзеныя з цярпліваcьці рабочыя абвясьцілі італьянскую забастоўку, патрабуючы зьмены загадчыка. Пасьля двухдзеннае забастоўкі, Ленартовіч быў в фабрыкі звольнены. («Роб.» 149).

У дзяржаўнай самалётнай фабрыцы ў Макатове рабочыя пасьля паўгадзіннае забастоўкі дамагліся зьмены расцэнак. («Гл. Пр.», 145).

СКАРАЧЭНЬНЕ ДАПАМОГІ БЕСПРАЦОЎНЫМ

ВАРШАВА, 30. На біржы працы ў Лодзі штодзенна рэгіструецца каля 400 новых беспрацоўных. Зачыняюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі. Ня гледячы на гэта міністар працы загадаў спыніць рэгістрацыю беспрацоўных на атрыманьне адназаровае дапамогі. У сучасны момант аднаразовую дапамогу атрымліваюць усяго 200 рабочых. («Роб.»).

Вясеньняя „паляваля работа" ў Польшчы

У Зах. Украіне, што пад Польшчай, сялянскі рух пашыраецца. Паліцыя усьмірае аружжам. (З газэт).

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЗВАЛЬНЕНЫХ РАБОЧЫХ

ВАРШАВА, 30. Перад будынкам міністэрства працы 29-га мая адбылася дэманстрацыя некалькіх сот рабочых, звольненых Варшаўскім магістратам в каналізацыйных работ. Паліцыя разагнала дэманстрацыю. («Гл. Пр.»).

ГОЛАД У ВІЛЕНШЧЫНЕ

ВАРШАВА, 1. «Кур'ер Варшаўскі» публікуе ліст уласнага карэспандэнта, які наведаў Дзісьненскі раён. Карэспандэнцыя мае загаловак: «У галадаючай Віленшчыне». Карэспандэнт падае свае гутаркі з галадаючымі. На запытаньне, данае селяніну—чым вы харчуецеся, карэспандэнт атрымаў адказ:

— Цяпер ужо ня бяда, падрасла трава. Вось мы нарэжам травы, згатуем і крупнік гатовы. Пакуль ня было травы было зусім дрэнна, прышлося прымешваць да мукі мёрзлае ільняное семя, кару і інш.

КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ ГАХОВА ПРАЦЫ

ВАРШАВА, 30. У капальні «Мар'ян» (Саснавецкага раёну) забіты абвалам каменьня рабочы Яцкоўскі.

У гуце «Банковай» загінуў пры працы рабочы сталя-ліцейнага аддзяленьня Ю. Куц і цяжка паранены разрывам апэтыленавана апарату рабочы Я. Богуш. («Роб.», 146).

У капальні «Вуек» (В. Сілезія) абвалам вугальня забіты рабочы С. Алескі. («Жэчп.», 142).

ПАВЕТРАНЫЯ КАТАСТРОФЫ

ВАРШАВА, 30. На прадмесьці Лодзі 24 мая ўпаў і разьбіўся вайсковы самалёт. Пры падзеньні самалёт перавярнуўся. Лётнік пасьпеў выскачыць раней і застаўся жывым. («Роб.», 146).

Каля Чэрніхова (пад Кракавам) упаў і разьбіўся самалёт Кракаўскага студэнцкага аэраклюбу. Лётнікі выратаваліся. («Роб.», 149).

Рэпрэсіі супроць францускай кампартыі

ПАРЫЖ, 29. Урадавыя рэпрэсіі супроць францускай кампартыі ўзмацняюцца. У Мэцэ арыштаваны адказны сакратар мясцовай камуністычнай газэты «Юманітэ» Сэмэр. Яго вінавацяць у надрукаваньні артыкулу, які заклікае вайскова-служачых да непаслушэнства.

Былы адказны рэдактар «Юманітэ» (парыскай) Дэні атрымаў паведамленьне ад судовага сьледчага, што супроць яго ўзбуджана 11 судовых спраў па абвінавачаньні яго ў закліку вайскова-служачых да непаслушэнства.

У Апіеры (у прадмесьцях Парыжу) паліцыя арыштавала двух рабочых, якія расклейвалі ў зьвязку з надыходзячымі муніцыпальнымі выбарамі, плякаты рабоча-сялянскага блёку.

9 рабочых-камуністых, арыштаваных у часе шэствія «да сьцяны камунараў», прыцягваюцца да судовае адказнасьці за «зьнявагу паліцыі».

Суд над рэдактарамі „Ротэ Фанэ"

БЭРЛІН, 31. Учора ў бэрлінскім судзе разглядалася справа адказных рэдактараў «Ротэ Фанэ» Гірша, Нордэна і Шрадэра. Рэдактарам было прад'яўлена абвінавачаньне ў тым, што ў «Ротэ Фанэ» было зьмешчана 30 артыкулаў, якія заклікалі да парушэньня забароны першамайскіх дэманстрацый. Пракурор дамагаўся, каб абвінавачаныя былі прысуджаны да 5 месяцаў турмы кожны. Суд прысудзіў абвінавачаных да 6.000 марак штрафу кожнага. У выпадку адмаўленьня ад уплаты штрафу, апошні замяняецца турэмным зьняволеньнем з разьліку 1 дзень турмы за кожныя 20 марак.

УРОКІ АСТРАХАНІ

У палоне клясавага ворага

Астрахань, як сацыяльна-эканамічная адзінка, прадстаўляе ў пэўнай меры, спрыяючае поле для размнажэньня бацыл бытавога загніваньня і разлажэньня. Партовы горад з прамысловасьцю, якая мае саматужны характар, са слабай рабочай праслойкай, амаль з адсутнасьцю індустрыяльнага пралетарыяту, але затое з вялікім кантынгэнтам мяшчанскіх і нэпманскіх элемэнтаў, у сялянскім акружэньні, ня можа не нараджаць мяшчан і хуліганаў, дробных капіталістых і буйных камэрцыйных акул, чыноўнікаў і шкоднікаў.

Але толькі да пэўнай ступені. Трэба-ж прыняць пад увагу, што чужым уплывам супроцьстаяць такія сур'ёзныя сілы, як партыйны і савецкі апарат у цэлым, як меры эканамічнага ўплыву дзяржавы і каапэрацыі, як грамадзкасьць і кантроль мас. Трэба таксама мець на ўвазе, што большасьць сялянскіх округ маюць такія-ж няспрыяючыя суадносіны клясавых сіл.

І тым ня менш, астраханская «справа» застаецца надзвычайна характэрным фактам, які дае ўяўленьне аб барацьбе клясавых сіл і клясавых уплываў у значна большай ступені, чым дзесяткі артыкулаў і брашур.

Гісторыя разлажэньня астраханскіх апаратаў,—гэта шлях пранікненьня каліталістычных элемэнтаў у поры і тканку савецкага арганізму. Формы ўплыву нэпманаў і гандляроў на апарат,—гэта спосаб барацьбы з пралетарскай дыктатурай, напад на слабыя вучасткі пралетарскага фронту.

Разлажэньне астраханскіх апаратаў прывяло ня толькі да п'янкі і крымінальшчыны і нават ня толькі да страт, яно стала зьмяняць суадносіны клясавых сіл у эканоміцы гэтага раёну, і прытым у самай важнай галіне яго эканомікі—у рыбнай прамысловасьці. Удзельная вага прыватніка ў промыслах і гандлі ўзвышалася, у той час, як па ўсёй краіне ў аспоўных галінах яе гаспадаркі і раёнах удзельная вага прыватнакапіталістычнага сэктару рэзка падае.

Орган мясцовае ўлады, партыйныя арганізацыі і органы грамадзкага кантролю мелі тут справу не з паасобнымі, няхай нават найбольш агіднымі, учынкамі тых ці іншых працаўнікоў апарату,—хоць трэба ўхітрыцца ў такім горадзе, як Астрахань, ня бачыць буйных бясчынстваў,—а з праявамі сур'ёзнага характару ў эканоміцы гораду і раёну. Рост або нават стабільнасьць прыватніка ў грунтоўнай галіне гаспадаркі не такая дробязь, якую можна ня прыкмеціць. Сакратары і члены бюро партыйных арганізацый, старшыні і члены выканкому, кіраўнікі прафсаюзаў і каапэрацыі павінны былі-б сядзець над сводкамі аб стане рыбнае прамысловасьці і ўдзельнай вазе ў ёй сацыялістычнага сэктару, як над стратэгічнай картай на тэатры ваеннае чынасьці. Тыя шляхі ўзмацненьня і ўмацаваньня сацыялістычнага сэктару, якія праводзяцца па ўсёй краіне, складаючы генэральную лінію партыі, а іменна, разьвіцьцё дзяржаўнай прамысловасьці, вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі, палепшаньне работы дзяржаўных і грамадзкіх апаратаў, уцягненьне мас у сацыялістычнае будаўніцтва, арабочаньне апаратаў, вылучэньне лепшых элемэнтаў рабочага і сялянскага актыву,—усё гэта павінна было быць прадметам іх нясупынных клопатаў.

Як-жа здарылася, што правядзеньне генэральнае лініі партыі затармазілася ў Астрахані. Малюнак разлажэньня дае на гэта яскравы і вычарпальны адказ Мяшчанскае, дробна - буржуазнае і капіталістычнае акружэньне ўвабрала ў сваё асяродзішча кіраўнікоў і працаўнікоў апарату. У адных, якія непасрэдна трымалі сувязь з нэпманамі і іх справамі, гэта выказалася ў хабарніцтве і падтрыманьні прыватнага капіталу, у іншых, якія не стаялі непасрэдна ля нэпманаўскіх спраў,—у страце клясавага чуцьця, адрывае ад партыі і мас, у страце эдольнасьці кіраваць надважнікамі пралетарскага ўплыву і ўзьдзейнічаньня. У партыйцаў, што разлажыліся, ідэі правага ўхілу сталі натуральным афармленьнем поглядаў, якія разьвіліся пад уплывам чужых элемэнтаў.

Апартунізм і правы ўхіл сталі ўсё больш укараняцца ў кіраўніцтва астраханскай партыйнай арганізацыі. З аб'екту ўзьдзейнічаньня чужых элемэнтаў некаторыя партыйцы, перараджаючыся, станавіліся кіруючым пачаткам непралетарскага ўплыву.

Астраханскі гнайнік трэба зрэзаць, каб ён не заражаў здаровае тканкі. Пастановы ЦК, ЦКК і ніжняволскага крайкому намячаюць меры рашучае ліквідацыі злачынстваў і іх вынікаў, вынясеньня спраў простых і ўскосных дапаможнікаў прыватнага капітала на суд грамадзкасьці і закону і глыбокага аздараўленьня мясцовае гаспадаркі, апаратаў і грамадзкіх арганізацый.

Рабочыя гораду і акругі, батрацтва, беднота і серадняк і ў вёсках павінны дапамагчы правядзеньню мерапрыемстваў, накіраваных да падняцьця мясцовае гаспадаркі, да ўзмацненьня ў ёй сацыялістычных элемэнтаў і выясьненьня нэпманаў і кулакоў, да засьбесьцяненьня надзейнага пралетарскага кіраўніцтва.

Урокі астраханскае «справы» заклікаюць нас да ўзмацненьня барацьбы з чужымі ўплывамі, да перамогі правага ўхілу і прымірэнчых адносін да яго. Мы павінны натачыць зброю клясавай пралетарскай ідэалёгіі.

З бальшавіцкай сьмеласьцю трэба ўцягнуць масы і лепшых іх прадстаўнікоў у органы кіраўніцтва, выклікаць да актыўнага жыцьця грамадзкасьць і масавую ініцыятыву. Трэба ня толькі папярэдзіць магчымасьць паўтарэньня астраханскіх «спраў», але і забясьпечыць хуткае прасоўваньне па шляху перамогі над капіталістычнымі элемэнтамі і пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму. («ПРАВДА»).

Сьвята савецкае кнігі

ШЛЯХ ПРАЛЕТАРСКАГА ДРУКАВАНАГА СЛОВА.— АД ПРАКЛЯМАЦЫІ НА ПАПЯРОСНАЙ ПАПЕРЫ ДА СУЧАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА —ВЕХА ДА ДАЛЕЙШАГА ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА УЗДЫМУ ПРАЦОЎНЫХ МАС. —МАЛАЙЦЫ, ТАВАРЫШЫ З ДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА!

МАСКВА, 31. У Калённай залі дому саюзаў 31-га мая адбыўся вечар, прысьвечаны дзесяцігодзьдзю дзяржаўнага выдавецтва. Усе прысутныя на вечарыходзе ўшанавалі ўставаньнем памяць загінуўшых працаўнікоў дзяржвыдавецтва т.т. Вароўскага, Скварцова-Сьцяпанава, Фурманава і інш.

Гучнымі воплескамі спаткаў сход сьпіс ганаровага прэзыдыуму, у які ўвайшлі члены палітбюро. Першым вітаў дзяржвыдавецтва М. І. Калінін.

— Аб капітоўчасьці кнігі, сказаў ён,—гаварыць ня трэба. Кожны з нас ведае, якая яна вялікая. Але ў дзесяць, у сотні раз большая капітоўнасьць кнігі масавай. **Наша сёнешняе сьвята,—сьвята масавай савецкай кнігі, сьвята савецкага выдавецтва, якое выпускае гэтую кнігу. Няхай сёнешні дзень будзе вехай на шляху да яшчэ большага інтэлектуальнага ўздыму працоўных мас, яшчэ большага, як дагэтуль, здавальненьня іх культурных патрэб.**

Доўгімі гучнымі воплескамі адказаў сход на прывітаньні т Калініна.

З прывітаньнем ад імя СНК выступіў тав. Луначарскі. У вялікай прамове ён зрабіў агляд гісторыі пралетарскага друкаванага слова, ад праклямацыі на папяроснай паперы да сучаснай прадукцыі дзяржвыдавецтва.

З прывітаньнем з Акадэміі Навук выступілі акадэмікі Губкін і Сакулін.

Ад падшэфнай дзяржвыдавецтва Глухаўскай мануфактуры сход вітала работніца Маўчанава. **Яна перадала наказ рабочых наблізі

ЗЬВЯЗДА

ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ЯЧЭЕК КП(б)Б

Пад знакам мабілізацыі партыйных мас для барацьбы з правым ухілам, правяраючы як нізавыя партарганізацыі ў практычнай рабоце забясьпечылі ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, шырокія партыйныя масы выбіраюць новыя кіруючыя органы ячэек

За практычным ажыцьцяўленьнем дырэктыў партыі

(Парткалектыў гарбарні «Бальшавік», Менск)

Парткалектыў гарбарні «Бальшавік»—гэта 5 цэхавых парт'ячэек з колькасьцю 200 партыйцаў, гэта—сапраўды баявы авангард чырвонапантэдартнага заводу.

Шпаркім тэмпам расьце гарбарня «Бальшавік». Ящчэ толькі 6 месяцаў назад, калі абіралася бюро парткалектыву, па гарбарні было 690 рабочых, а зараз—820 чалавек. На капітальнае буданіцтва за апошнія 6 месяцаў было выдаткавана 125 тысяч руб.

Гэтыя лічбы ў агульным даюць малюнак размаху ў росьце гарбарні.

Зусім зразумела, што кіраваць такім вялікім калектывам рабочых, кіраваць работай такога вялікага прадпрыемства можа толькі парткалектыў, які няўхільна ажыцьцяўляе ленінскую лінію партыі. І ў сваёй практычнай рабоце на працягу ўсяго пэрыяду калектыў стаяў на ленінскіх пазыцыях, вёў рашучую барацьбу за генэральную лінію партыі.

Парткалектыў у свой час даў жорсткі адпор контр-рэвалюцыянэрам троцкістым, якія перашкаджалі разьвіваць работу сваёй антысавецкай дзейнасьцю на заводзе. Парткалектыў рашуча асудзіў і змагаецца супроць праяў правага ўхілу і прымірэнцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва... Рабочыя вельмі горача адгукнуліся на заклік партыі аб узьнаўленьні прадукцыйнасьці, паляпшэньні якасьці прадукцыі, зьніжэньні сабекошту. Адна за другой у заводскіраўніцтва пасыпаліся заявы груп і асобных рабочых аб добраахвотным зьніжэньні расцэнак і павышэньні норм вырабу. На 22-е мая такіх заяў было 167. **У зьвязку з гэтым гарбарняй дасягнута эканоміі ў 1.140 руб. у месяц.** Працоўная дысцыпліна ўзмацнілася, прадукцыйнасьць працы пайшла ўгару.

Але заводзкія арганізацыі ня зусім поўна выкарыстоўваюць энтузіязм рабочых мас гарбарні, не разгортваюць сыстэматычнай работы для ўцягненьня ў спаборніцтва ўсё новых і новых рабочых. Арганізаваныя ўдарныя брыгады не заўсёды адчуваюцца на гарбарні. А сярод вучнёўства ўдарных брыгад зусім няма.

Масавая культурна-выхаваўчая работа парткалектыву накідае чакаць шмат лепшага. З новым кадрам рабочых, што нядаўна прыйшлі на завод, работа вядзецца слаба. У выніку чаго на заводзе з боку панава прыбыўшых рабочых мелі месца выпадкі праяўленьня антысэмітызму (справа Ганчарыка і інш.) і яўрэйскага шавінізму. Слабая партыйна-выхаваўчая работа ня можа не адбіцца на стойкасьці некаторых асобных таварышоў. Ёсьць асобныя партыйцы, якія не разумеюць сутнасьці правага ўхілу, выказваюць думкі і адбіваюць настроі адсталых колаў рабочых.

Кіраўніцтва камсамолам стаяла не на належнай вышыні. У камсамольскім калектыве наглядаўся рад хваравітых зьяўішч. Досыць паказаць на тое, што на апошніх перавыбарах бюро калектыву ЛКСМБ сакратаром калектыву быў абраны вядомы на заводзе прагульшчык.

Зараз хворыя зьяўішчы ў камсамольскім калектыве ажываюцца.

***

Справаздача і перавыбары бюро калектывы адбываліся на працягу трох вечароў.

У новае бюро абрана 11 членаў і 3 кандыдаты.

С. Г—н.

Умелае кіраўніцтва палепшыла работу прадпрыемства

(Мазыр)

Справаздачна-перавыбарчы сход у партыйнай ячэйцы «Камбінат» прайшоў пад знакам шырокай самакрытыкі.

Партыйная ячэйка за справаздачны пэрыяд шмат увагі ў сваёй рабоце адводзіла кіраўніцтву гаспадарчым жыцьцём тых прадпрыемстваў, якія абслугоўвае ячэйка. І трэба сказаць, што практычныя вынікі ад гэтага значныя як у галіне падняцьця прадукцыйнасьці працы (на «Прафінтэрне» на 24.4% за першае паўгодзьдзе 1928-29 г.), так і па падняцьці вытворчай дысцыпліны і ў інш. галінах.

У масавай рабоце ячэйкі быў за справаздачны пэрыяд заўважаны пералом у бок некаторага ажыўленьня гэтай галіны работы: праводзіліся масавыя сходы на прадпрыемствах па важнейшых пытаньнях вытворчага жыцьця; праводзіліся нарады вылучэнцаў, жалчын па пытаньнях асобных галін работы.

За справаздачны пэрыяд ячэйкай вылучана на розныя адказныя работы больш 10 чал. рабочых. У сувязі з тым, што на радзе прадпрыемстваў, якія абслугоўваюцца ячэйкай, па кіраўчыя пасады вылучаны маладыя партыйцы-рабочыя, якія ня маюць належнае практыкі ў працы, ячэйцы ў будучым трэба будзе практычна ў штодзённай рабоце дапамагаць вылучэнцам.

Не малая работа была прароблена ячэйкай па вярбоўцы рабочых у парт.тыю. За справаздачны пэрыяд ячэйкай прынята ў кандыдаты партыі 16 чалавек. Такі рост ячэйкі даў магчымасьць выдзеліць некалькі часу таму назад асобную парт'ячэйку працкалектываў.

Ва ўнутраным становішчы ячэйкі ёсьць рад нездаровых зьявішч. Многія партыйцы не адчувалі належнай адказнасьці за выкананьне сваіх партыйных абавязкаў і даручэньняў, што даваліся ім парт'ячэйкай і інш.

Ячэйка ня ўбачыла галоўнага

(Прапойская ячэйка КП(б)Б, Магілеўскае акругі)

Як рэагавала ячэйка на скажэньні клясавай лініі ў рабоце тых устаноў, якія яна абслугоўвае.

Гэта першае пытаньне, якое трэба паставіць пры высьвятленьні стану і дзейнасьці Прапойскай ячэйкі. Даная ячэйка складаецца з партыйцаў, якія працуюць у савецкіх і каапэрацыйных установах раёну, абхапляе сваім абслугоўваньнем рад устаноў. І, здавалася-б, што справа кіраўніцтва работай гэтых устаноў павінна была-б займаць асноўную ўвагу ячэйкі. Аднак, на справе было адваротнае. Тая бязуважлівасьць да кіраўніцтва работай устаноў, да барацьбы за выразную клясавую лінію ў іх рабоце давала да таго, што рад агіднейшых фактаў знайшлі месца ў некаторых установах. Тут досыць паказаць на саматужна-прамысловае таварыства, дзе кіравалі ўсёй справай былыя гандляры, спэкулянты, чужы элемэнт. Партыйцы, якія там працавалі, утойвалі гэта ад партарганізацыі. Работа сярод местачковай беднаты ячэйкай праводзілася дрэнгоўваньнем вёсак, якія знаходзяцца пры местачку і ўваходзяць у тэрыторыю, што абслугоўваецца ячэйкай. Пры правядзеньні пасеўнай кампаніі ячэйка правяла толькі адзін сход сялян, ня ставіла практычна пытаньня аб дапамозе беднаце, слаба папулярызавала сярод сялян задачы пашырэньня пасеўнай плошчы і г. д. І самае вялікае ўпушчэньне ячэйкі тое, што яна не падрыхтавала беднаты аднае з вёсак да землеўпараджаваньня. Ячэйка толькі тады ўзялася за гэта, калі прыехалі каморнікі праводзіць працу па землеўпараджаваньні. Таму на сходзе па пытаньні зямлеўпарадкаваньня бедната не змагла даць адпаведнага адпору кулацтву, якое ўсямерна імкнулася падарваць справу зямлеўпарадкаваньня. Нельга абмінуць і такога факту. Калі на памянёным сходзе сялян кулакі выступалі супроць зямлеўпарадкаваньня, супроць калектывізацыі, дык нават партыйцы, якія прысутнічалі на гэтым сходзе, не далі ім адпору.

З усяго паданага выцякае, што ячэйка ў практычнай рабоце ня мела выразна клясавага твару, не апіралася ў рабоце на местачковую і сялянскую беднату.

Кіраўніцтва местачковым саветам было далёка невыстарчальным, дырэктывы партыі аб ажыўленьні работы саветаў ня выконваліся (камісіі пры местачковым савеце не працуюць, пленумы саветаў актыў беднаты не наведвае і г. д.).

Пасьля перавыбараў бюро ячэйкі галоўным чынам павінна ўзяцца за правеку выкананьня партыйных дырэктыў, за свячасовае рэагаваньне на факты скажэньня клясавай лініі ў савецкіх установах.

ШЧАКАЛАЎ.

Наступленьне на кулака і правы ўхіл ва ЎсеКП(б)

(Да вынікаў XVI партканфэрэнцыі)

Пралетарыят СССР будуе сацыялізм. Гэта будаўніцтва захапляе ня толькі горад, але і вёску. Зараз падыйшла пара цяжкой работы па перабудаваньні сельскае гаспадаркі на новых сацыялістычных пачатках.

Гэтае перабудаваньне пралетарыяту прыходзіцца весьці ва ўмовах распластаваньня сялянства на беднякоў, сераднякоў, прычым кожная з гэтых груп адносіцца да гэтага перабудаваньня розна. Бядняк вусім яму спачувае і горача падтрымлівае. Серадняк хістаецца—ён нібы ва, нібы супроць. Пра кулака гаварыць ня прыходзіцца—ён напэўна супроць будаўніцтва калгасаў і саўгасаў.

Улічваючы гэтую расстаноўку клясавых сіл у вёсцы, партыя пралетарыяту робіць вывад: рабочая клясва, апіраючыся на беднату вёскі, павінна прыцягнуць на свой бок серадняка і перайсьці ў рашучае наступленьне на кулака, што азначае ўзмоцненае абкладаньне кулацтва падаткамі, забесьпячэньне праў батрацтва, назбаўленьне кулакоў выбарчых праў і г. д. Станоўчай часткай праграмы пралетарыяту зьяўляецца ўзмацненьне будаўніцтва калгасаў і саўгасаў.

Правыя ўкланістыя ў радох УсеКП(б) знаходзяць гэтую палітыку партыі няправільнай. Яны гавораць, што наша сельская гаспадарка коціцца пад гору і што для яе выратаваньня трэба даць магчымасьць усяму сялянству, у тым ліку і кулацтву, разгарнуць свае індывідуальныя гаспадаркі. Правыя ўкланістыя лічаць, што пры тым вялікім разьвіцьці прамысловасьці, якое ў нас зараз праводзіцца, сялянскія дробныя гаспадаркі, у тым ліку і кулацкія, «мірна ўрастуць у сацыялізм». Яны спасылаюцца пры гэтым на каапэрацыйны плян У. І. Леніна, мяркуючы, што праз каапэрацыю можна ўключыць і кулацкія гаспадаркі ў агульную сацыялістычную гаспадарчую сыстэму. Акрамя таго, правыя ўкланістыя мяркуюць, што цяпер, у момант значнага адставаньня сельскае гаспадаркі ад росту прамысловасьці, няма ніякай патрэбы асабліва энэргічна дамагацца арганізацыі калгасаў і саўгасаў. Ня цяжка бачыць, што такога роду гутаркі—вада на кулацкі млын.

Правыя ўкланістыя забываюць, што яшчэ пры ўстанаўленьні НЭП'у (1921 г.) У. І. Ленін ставіў пытаньне: «Хто каго?» Зараз гэта «хто каго?»—стаіць больш востра, чым калі-б там ні было. У інтарэсах пралетарыяту гораду, у інтарэсах вясковай беднаты, у інтарэсах сераднякa нам патрэбна звышпармавая напружанасьць усіх сіл каб паскорыць разьвіцьцё сельскае гаспадаркі. Цяпер усякі школьнік ведае, што гэты рост магчымы толькі пры ўмове ўзбуйненьня, аб'яднаньня дробных адзінаасабовых гаспадарак. Толькі буйная гаспадарка, забясьпечаная ўсімі найноўшымі прыладамі тэхнікі, забясьпечаная навуковымі парадамі і кіраўніцтвам, можа даць нам патрэбную колькасьць сельска-гаспадарчай прадукцыі. Гэтага мы даб'емся праз добра арганізаваныя калгасы і саўгасы. І гэта трэба рабіць неадкладна, зараз, інакш разрыў сельскае гаспадаркі і прамысловасьці можа стаць няўхільным.

Надзвычайна важнае значэньне мае тое, што вясковая бедната і серадняк у масе ў значнай меры ўжо разварушыліся і ідуць на гэтую справу. Толькі кулак—найбольшы вораг сацыялізму—«рвет и мечет», нападаючы на сялян-актывістых, на камуністых, падпальваючы калгасы, хаты-чытальні і г. д. І правыя ўкланістыя, што сьпяваюць «беднага Лазара», урэшце граюць у руку з вясковымі пагромшчыкамі, выступаючы в прапановаю зьнізіць з іх падаткі, не сьпяшаюцца з калгасамі і г. д.

XVI партканфэрэнцыя, заслухаўшы даклад тав. Калініна аб шляхох разьвіцьця сельскае гаспадаркі і падатковае палёгкі серадняка, самым рашучым чынам выказалася супроць прапаноў правых ўкланістых. Канфэрэнцыя прызнала іх разважаньні яўна антыпралетарскімі, якія вядуць да разбраеньня рабочае клясы перад яе клясавымі ворагамі, да ўсыпленьня рэвалюцыйнае пільнасьці пралетарыяту, да паслабленьня яго баяздольнасьці ў барацьбе за перамогу гаспадарчых труднасьцяй на аснове генэральнай лініі партыі. Канфэрэнцыя ящчэ раз падкрэсьліла надзвычайную важнасьць іменна ў даны момант актыўнага наступленьня на кулацтва і ящчэ больш настойлівага праяўленьня палітыкі будаўніцтва калгасаў і саўгасаў.

А. Ш.

Ад камісіі ЦККК УсеКП(б)

па праверцы членаў і кандыдатаў ЦК, членаў рэвізійнай камісіі і членаў ЦККК КП(б)Б

У зьмену і дапаўненьне да апублікаванага сьпісу таварышоў, якія падлягаюць праверцы камісіяй ЦККК УсеКП(б), паведамляе, што:

1) Таварышы: **Цімашэнка**—камандзір і камісар корпусу, **Крохмаль**—пам. па палітчастцы корпусу, **Бачараў**—**начальнік падзіву, Новікаў**—адказны сакратар ДПК—праходзяць праверку на лягерным адкрытым партсходзе 7-га чэрвеня 1929 г. а 10 гадз. раніцы.

2) Тав. **Балашоў**—начальнік падзіву, тав. **Шаўцоў**—адказны сакратар ДПК, т. **Васілевіч**—начальнік АБВШ, т. **Раманаў**—адказны сакратар АБВШ—праходзяць праверку на лягерным аб'яднаным адкрытым партсходзе 5-га чэрвеня а 10 гадз. раніцы.

Тав. **Пінская** праходзіць праверку па 4 куставым сходзе ў клюбе Карла Маркса 7-га чэрвеня а 6 гадзіне ўвечары.

Камісія ЦККК УсеКП(б).

Партыйныя масы павінны ведаць, як будзе праводзіцца праверка і чыстка партыі

I. Асобныя задачы і мэтады чысткі і праверкі нявытворчых ячэек УсеКП(б)

(Інструкцыйны ліст партканцэлярыі ЦКК УсеКП(б)

У дапаўненьне да агульнай інструкцыі пры чысткі і праверцы работы нявытворчых ячэек трэба ўлічыць асабліва цяжкія ўмовы работы гэтых ячэек.

«Цяперашні савецкі апарат ящчэ моцна прасякнуты элемэнтамі старога чыноўніцтва і рэшткамі раней пануючых кляс, у якіх ящчэ жыве нянавісьць да савецкага ладу. Бюракратычныя скажэньні, няўважлівасьць да патрэб працоўных, абураючая інтэргнасьць і злачынная цяганіна нярэдка падрываюць работу дзяржпрагаду. Пасобныя зьвенні дзяржаўна-каапэрацыйнага апарату даходзяць да простага разлажэньня і зрастаньня з буржуазна-капіталістычнымі элемэнтамі насельніцтва, выклікаючы неабходнасьць карэннай чысткі гэтых органаў» (рэзалюцыя лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1928 г.).

У сувязі з такім акружэньнем і аб'ектам работы нявытворчых ячэек «дзярж апарат у аблічы яго старога чыноўнічага ладу накладае свой адбітак на некаторую частку камуністычнага складу, які ў ім працуе» (рэзалюцыя лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

З другога боку, у апаратах савецкіх, каапэрацыйных і гаспадарчых органаў «да нас прысмакталіся сям-там кар'ерыстыя, авантурнікі, якія назваліся камуністамі і ашукваюць нас, якія палезьлі да нас таму, што камуністыя цяпер маюць уладу» (Ленін).

Гэта засьмечанасьць савецкага, каапэрацыйнага і гаспадарчага апарату, а таксама і гэты «адбітак» уплыву яго на некаторых камуністых зьяўляецца асноўнай прычынай асобных відаў нездаровых зьявішч у гэтых ячэйках і крыніцаю, якая харчуе дробна-буржуазныя хістальні, правы ўхіл і прымірэнцтва ў партыі.

Адрыў ад шырокіх мас працоўных і акружэньне супрацоўнікамі апарату, сярод якіх ячэйка праводзіць сваю работу, служыць важнейшымі прычынамі праяўленьня бюракратызму, цяганіны, пратэкцыянізму, склокі, падхалімства і бытавога зблізьненьня з чужым элемэнтам, падседжваньня, растрат, загніваньня, перараджэньня, супрацьўленьня вылучэнству, а адсюль ідэёвага разбраеньня і паніжэньня баяздольнасьці паасобных камуністых.

У пастанове ЦК УсеКП(б) ад 20 сьнежня 1926 г. было дано ўказаньне:

«Накіраваць галоўную ўвагу савецкіх ячэек на правядзеньне ў сваіх установах барацьбы з безгаспадарчасьцю, расстратамі, цяганінай, фармальным адносінамі да справы, пратэкцыянізмам, разбуханьнем штату і інш., надтрымліваючы як сярод членаў ячэйкі, так і сярод беспартыйных усякую ініцыятыву ў справе спрашчэньня і патаньненьня апарату».

Грунтуючыся на гэтых асабліва ў мовах работы нявытворчых ячэек і значэньні іх задач, чыстка іх павінна ісьці побач з асабліва дакладнай праверкай якасьці іх работы.

АБСЬЛЕДВАНЬНЕ ЯКАСЬЦІ РАБОТЫ НЯВЫТВОРЧЫХ ЯЧЭЕК

У дадатак да п. 28 разьдзелу IV агульнай інструкцыі, пры абсьледваньні работы нявытворчых ячэек трэба высьветліць:

1. Як выконваецца пастанова ЦК УсеКП(б) ад 20 сьнежня 1926 г. аб савецкіх ячэйках і якія вынікі гэтай работы.

2. Работу ячэйкі ў арганізацыі апоры на масы працоўных, што абслугоўваюцца данай установай ці маюць да яе дачыненьне.

3. Роля ячэйкі ва ўстанаўленьні сувязі членаў ячэйкі з шырокімі пралетарскімі масамі і ў прыцягненьні мас да паляпшэньня апарату, да барацьбы з бюракратызмам, безгаспадарчасьцю, засьмечанасьцю апарату. Мэтады і вынікі гэтай работы.

4. Актыўнасьць ячэйкі ў пытаньні вылучэньня і ў барацьбе з заціраньнем вылучэнцаў.

5. Вынікі работы ячэйкі ў разгортваньні і правядзеньні самакрытыкі (недахваты і дасягненьні).

6. Работа ячэйкі па выхаваньні членаў ячэйкі, па ўмацаваньні згуртаваньня, па барацьбе з загніваньнем, бытавым разлажэньнем і па папярэджаньні выпадкаў сувязі з чужым элемэнтам у паасобных членаў ячэйкі (свалчасовасьць ускрыцьця і папярэджаньня).

7. Масавая работа ячэйкі сярод беспартыйных супрацоўнікаў установы (прафсаюзы, эканомкамісіі, насьцентаэта, добраахвотныя таварыствы і інш.) з пункту погляду прыцягненьня беспартыйных да барацьбы з бюракратызмам (асабліва прыцягненьне маладняка, які вырас у новых умовах работы).

МЭТАДЫ АБСЬЛЕДВАНЬНЯ РОЗНЫХ ГРУП НЯВЫТВОРЧЫХ ЯЧЭЕК

З прычыны некаторых адрозьніваючых асабліваськцяй, уласьцівых розным катэгорыям нявытворчых ячэек, пры праверцы якасьці работы гэтых ячэек трэба ўжываць розныя падыходы з улікам гэтых асабліваськцяй. У гэтых адносінах нявытворчыя ячэйкі можна падзяліць, прыкладна, на наступныя групы для ўстанаўленьня асобных мэтадаў падыходу пры праверцы іх работы:

1. Ячэйкі пры установах, зьвязаных у бягучай рабоце з пралетарскімі масамі, напрыклад, пры трэстах, прафсаюзах, органах працы, сацстраху, рабочай спажывецкай і жыльлёвай каапэрацыі і г. д.

2. Ячэйкі пры установах, зьвязаных з сялянскімі масамі, напрыклад, земорганы, с.-г. каапэрацыя, с.-г. крэдытная каапэрацыя, с.-г. банкі, сельтрэсты, дамы селяніна, усерабземлес і г. д.

3. Ячэйкі пры культурных установах: органы асьветы, аховы здароўя, парткамітэты і інш.

4. Ячэйкі пры адміністрацыйных і судовых установах: органы ўнутраных спраў, кіраўніцтва, міліцыі, нарсуду і г. д.

5. Ячэйкі навучальных устаноў.

Прыстасоўна да розных груп нявытворчых ячэек пры праверцы якасьці іх работы трэба, акрамя агульных пытаньняў, высьветліць асобныя дадатковыя пытаньні іх работы, як напрыклад, пры праверцы работы ячэек пры установах земорганаў і с-г. крэдыту трэба дадаткова высьвяліць, што зроблена ячэйкай па папярэджаньні выпадкаў скажэньня палітыкі крэдытаваньня, мапшыназабесьпячэньня і інш.; ячэек пры біржах працы—роля ячэйкі ў барацьбе з пратэкцыянізмам, засьмечанасьцю апарату, бюракратызмам, растратамі і інш.

Даклады аб выніках праверкі некаторых ячэек могуць быць пастаўлены на сходах рабочых, што абслугоўваюцца данай установай, напрыклад, ячэйкі трэсту—на сходзе рабочых прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у трэст; ячэйкі пры праўленьні чыгунак—на сходзе рабочых чыгуначных майстэрань; ячэйкі пры вытворчых прафсаюзах—на адпаведных сходах рабочых буйных тэкстыльных фабрык, мэталёвых заводаў і г. д.

Перад праверкай ячэйкі трэба таксама атрымаць у тэй або іншай форме водгукі аб установах ад рабочых, што абслугоўваюцца данай установай, дзеля чаго трэба раней паведаміць рабочым арганізацыі аб надыходзячай праверцы ячэйкі такой установы з паказаньнем спосабаў прысылкі адпаведных матар'ялаў ад рабочых для камісіі.

(Інструкцыйныя лісты ящчэ будуць друкавацца).

ЯК АНГЛІЯ РЫХТУЕ ПАВЕТРАНУЮ ВАЙНУ СУПРОЦЬ СССР

Восьсю ўсёй сваёй палітыкі кансэрватары зрабілі самую інтэнсыўную падрыхтоўку да вайны наогул і, у першую чаргу, супроць СССР. У гэтых і толькі ў гэтых адносінах кансэрватары і маглі-б пахваліцца ў часе прадвыбарчай кампаніі, што адбываецца, сякімі-такімі «дасягненьнямі», калі-б «добры тон» імпэрыялізму дазваляў хваліцца такімі посьпехамі.

Калі ўзяць толькі апошнія месяцы, то і за гэты кароткі час знойдзецца нямала вельмі цікавых фактаў, якія пацьвярджаюць сказанае вышэй. Мы абмяжуемся толькі фактамі з галіны паветранай падрыхтоўкі да вайны супроць СССР.

Чаму мы бярэм іменна паветраную падрыхтоўку?

Наш выбар тлумачыцца тым, што паветраныя сілы ў будучай вайне супроць СССР павінны будуць адыграць, паводле ангельскіх прадстаўленьняў, вельмі важную ролю. Потым трэба адзначыць, што паветраная падрыхтоўка наогул больш рэльефна выкрывае сапраўдныя намеры імпэрыялістычных дзяржаў, бо паветраны флёт—новы, ящчэ ўзрастаючы баявы сродак.

Армія і флёт мелі цэлыя стагодзьдзі на падрыхтоўку баз і шляхоў для сваіх дзеяньняў і на разьвіцьцё сваіх сродкаў нападу і абароны. Паветранаму-ж флёту і базы, і шляхі да іх, і баявыя сродкі, і асабовы склад, асабліва камандны, прыходзіцца стварацъ нанава ў адносна вельмі кароткі тэрмін.

Вось чаму нагляд за паветранай падрыхтоўкай да вайны дае вельмі шмат адпраўных момантаў для разуменьня ангельскіх плянаў.

Асабліва інтэнсыўная падрыхтоўка за апошнія месяцы вядзецца ў Азіі. Паветраныя сілы Індыі ў самым канцы мінулага году павялічаны на дзьве бамбардыровачныя эскадры, узброеныя пераважнымі самалётамі. Большасьць з 8 індыйскіх эскадрыльляў прызначаны для наступальных апэрацый. За выключэньнем дзьвёх, усе эскадрыльлі Індыі ў пачатку 1929 году пераўзброены на самалёты самых апошніх узораў, спэцыяльна прыстасаваныя для дзеяньня ў маланаселеных і малакультурных краінах. Самалёты цалкам мэталічныя, маюць хуткасьць 240 клм. у гадзіну і вялікую грузападзёмнасьць.

Супроць каго накіраваны гэтыя сілы? Наступныя факты ясна аб гэтым гавораць.

Ангельцы зрабілі грунтоўную рэкагнасцыроўку паветранага тэатру дзеяньня Аўганістану пад відам... эвакуацыі жанчын з Кабулу. Гэта характэрная для ангельцаў рыса—абрабляць свае справы пад «благавідным предлогом».

Аўганскую міжусобіцу ангельскае камандаваньне спрытна скарыстала і для таго, каб зрабіць важны вучэбны маневр—тэрміновае перакідваньне на паветры (40 лётных гадзін) на вялікія адлегласьці шматматорных бамбардыроўшчыкаў (з мэтраполіі, Эгіпту і Іраку ў Індыю і Аўганістан).

Ці варта гаварыць, што ўсе гэтыя самалёты патрэбны былі для «выратаваньня з Кабулу жанчын і дзяцей»?

Зо сакавіка гэтага году адкрылася паветраная магістраль Англія—Індыя.

Лінія праходзіць праз Францыю, Швайцарыю, Італію, Грэцыю, Эгінэт, Ірак і Пэрсію, г. зн. яна злучае краіны, цесна зьвязаныя з Англіяй у ваенна-палітычных адносінах. Лінія мае вялікае ваеннае значэньне, прадастаўляючы магчымасьць свабодна манэўраваць ангельскім паветраным сілам на ўсім Блізкім і Сярэднім Усходзе. Прасьцей гаворачы, па гэтай паветранай лініі ангельцы могуць перакідаць свае паветраныя сілы для дзеяньняў на ўсім нашым Каўказе (Баку) і супроць Сярэдняй-Азіяцкіх рэспублік.

У зьвязку з папярэднім, асабліва значэньне набывае нядаўняе стварэньне ў Басры (на р. Шат-эль-Араб, 80 км. ад Пэрсыдзкае затокі) ангельскай паветранай базы, куды ўжо прыляцела эскадрыльля двухматорных лётаючых лодак «Саўсэмптон». «Саўсэмптоны»—першаклясныя дальнія разьведчыкі і бамбардыроўшчыкі. У выпадку патрэбы ў некалькі гадзін яны могуць быць перакінуты з Басры ў Касьпійскае мора для апэрацый супроць Баку.

Англія ў паветраных адносінах робіць зараз тое самае, што некалі ўмацавала яе морскую магутнасьць. Яна загадзя, мэтадычна будуе апорныя пункты сваёй магутнасьці—у даным выпадку, паветраныя базы,—у найбольш важных для яе мэтах адпраўленьня, злучаючы іх паміж сабою павуцінньем паветраных пляхоў.

Такую-ж паветраную базу з канца 1928 году ангельцы маюць у Кітаі (у Кай-Так, Гонконг). Для характарыстыкі ўзрошчана паветранага ўплыву Англіі ў Кітаі цікавы факт заказу нанкінскім урадам паўтара дзесятка самалётаў ангельскім фірмам.

Вельмі сымптаматычна таксама, што ў апошніх нумарох ангельскіх сур'ёзных вайсковых часопісяй забаранілі артыкулы, якія разглядаюць умовы работы паветраных сіл у Пэрсіі, Іраку, Індыі, Аўганістане, Каўказе. Маёр Блэкер у артыкуле «Механізаваная вайна ў Азіі» проста гаворыць аб вайне ва Ўсходняй Эўропе. Найноўшы баявы сродак — «автожир»—і мэханізаваныя вайсковыя часьці аўтар лічыць вельмі адпаведнымі на паўночных граніцах Індыі, у Курдыстане і Каўказе.

Зусім нядаўна ў строй Міжземнага флёту ўвайшоў новы буйны авіяносец «Караджос», які нясе на сябе 72-100 самалётаў. Такім чынам, разам з авіяносцам «Ігл», ангельцы маюць цяпер у Міжземным моры каля 150-200 самалётаў, якія могуць быць у кароткі тэрмін сканцэнтраваны ў Чорным моры. У зьвязку з гэтым узмацненьнем паветраных сіл на высьпе Мальтэ, паветранаморскай базе Міжземнага мора, гэтымі днямі адкрыты новы эрадром.

У пачатку 1929 г. скончылася поўнае пераўзброеньне ангельскіх паветраных сіл на найноўшыя самалёты. Але гэтага мала для ангельскіх імпэрыялістых. Як вядома з гісторыі імпэрыялістычнай Англіі, яна адзначаецца ўменьнем заграбаць жар чужымі рукамі. Таму зразумела яе блазуцкінныя намаганьні па паветраным пераўзбраеньні і ўмацаваньні паветраных сіл заходніх, сумежных з СССР дзяржаў.

Асаблівую ўвагу Англія зьвяртае на Фінляндыю і Эстонію.

«Любезность» у адносінах да Фінляндыі зайшла так далёка, што, напрыклад, начальніку фінскіх паветраных сіл Вуоры, дазволена было ў пачацьцягу году вывучаць паветраную справу Англіі! Вуоры толькі ў канцы мінулага году вярнуўся з Англіі.

Эстонія будуе свой паветраны флёт пад выключным уплывам ангельцаў. Раней у Эстоніі быў адзін пастаянны паветраны дарадца, а ў апошні час іх ужо есьць тры.

Латвія таксама паступіла на вывучку да Англіі.

Падобнае ўмяшаньне ў справы сумежных краін вельмі выгоднае для ангельскіх авіяцыйных прамыслоўцаў. Ангельская дарадцы, зразумела, раяць набываць толькі ангельскія самалёты, маторы, узбраеньне і г. д. па лёзунгу «Нідзе, акрамя як... у Брыт. Авіяпроме».

Толькі за апошнія месяцы у сумежныя краіны прыбыла ня менш трох дзесяткаў ангельскіх самалётаў.

Як толькі ў Англіі зьявіліся фатаграфіі самалётаў «Р—1», «Нашадказ Чэмбэрлену», як ангельская авіяпрамысловасьць спэцыяльна супроць яго стварыла для сумежных краін зьнішчыцель «Лінкок».

Можна было ящчэ і ящчэ далей працягнуць сьпіс падобных-жа фактаў, якія гавораць аб падрыхтоўцы Англіі ня толькі ў паветры, але і на суха-зем'і і на моры. Але і паданага досыць, каб зрабілася ясным, што «Мальбрук у паход сабраўся».

Кансэрватыўны ўрад, трэба спадзявацца, дажывае свае апошнія дні. Далейшае кіраўніцтва цьвёрдалобых дарэ-жаўных караблём—простая пагроза міру. Трэба думаць, што «галасуючая жывёлінка» (так кансэрватары завуць выбарчыкаў), якая ашукваецца на кожным кроку, усё-ж зразумела, што кансэрватары прынесьлі ў ахвяру самыя штодзённыя інтарэсы краіны і імпэрыі з-за хімэры—зьнішчыць СССР.

Па СССР

НАФТА НА УРАЛЕ

Управа для кіраўніцтва буравымі работамі.—Закладка 6 шчылін

МАСКВА, 31. Нарада ў намесьніка старшыні ВСНГ СССР тав. І. В. Касёра, з удзелам прафсаюзаў І. Н. Прыжова і І. І. Харчанка намецілa рад практычных мерапрыемстваў для хутчэйшай арганізацыі нафтавае гаспадаркі на Урале.

Пастаноўлена арганізаваць у Верхне-Чусавскіх Гарадках асобную Управу для кіраўніцтва ўсімі буравымі работамі і вядзеньня ўсяе гаспадаркі на плошчы, намечанай для закладкі разьведвальных шчылін Гзалёгінаму каміцэту даручана, апрача намечаных ужо 5 новых шчылін, выбраць па сваім меркаваньні месца для закладкі шостай шчыліны, бураваньне якой павінна быць арганізавана не пазьней 1-га ліпеня. «Главгортоп» абавязваецца прадуледзіць на будучы год магчымасьць бураваньня ў Чусавскім раёне 20-30 шчылін. Разам з тым, «Главгортоп» павінен у двухтыднёвы тэрмін прадставіць плян далейшых работ на Урале і ва ўсёй ўнутры-ўрапэйскай частцы СССР з тым, каб некаторую частку гэтых работ можна было пачаць ящчэ ў бягучым годзе.

«Главгортопу» дазваляецца выдзяліць у сваім апараце 2-х спэцыялістых для работы па пытаньнях Чусавскага нафтанараджаньня. Чусавскай Управе дазваляецца мець у Маскве сваё прадстаўніцтва.

НОВЫ НАФТАВЫ ФАНТАН

БАКУ, 29. 26-га мая на першым промысьле Азнафты ў сьвідравальнай шчыліне № 337 забіў нафтавы фантан. У апошнія суткі фантан даў 2.000 тон. (ТАСС).

100.000 аўтамабіляў у год

БУДЗЕ ВЫПУШЧАЦЬ НІЖАГАРОДЗКІ АЎТА-ГІГАНТ

МАСКВА, 31. Прэзыдыум ВСНГ СССР зацьвердзіў асноўнае заданьне для нижагародзкага аўта-заводу-гіганта. Завод будзе выпушчаць што год 30.000 легкавых і 70.000 грузавых машын. Першая зборка машын «з імпартных і ўласных дэталей» будзе пастаўлена на аўта-заводзе ў Ніжнім.

Прэзыдыум зацьвердзіў таксама намечаны «Главмашстроем» плян разьвіцьця аўтабудаўніцтва на існуючых заводах аўтатрэсту (АМО, Яраслаўскі і інш.). У плянах прадугледжваецца выпуск аўтамашын да канца пяцігодкі на ўсіх заводах да 253.000.

Канцэсійная палітыка СССР

МАСКВА, 29. З 1921 году па 1-га мая 1929 г. усяго паступіла на разгляд галоўнага канцэсійнага камітэту 2.559 канцэсійных прапаноў і прапаноў на заключэньне дагавораў аб тэхдапамозе.

Першае месца па колькасьці прапаноў належыць Нямеччыне, другое—ПАЗШ, 3-е—Англіі. Вялікая зацікаўленасьць замежных дзелавых колаў да канцэсійнай работы СССР наглядаецца пасьля пастановы ўраду аб актывізацыі канцэсійнай палітыкі. За 7 месяцаў бягучага году па 1-га мая ўсяго паступіла 125 канцэсійных прапаноў і 34 прапановы аб тэхнічнай дапамозе. (ТАСС).

Экспарт данецкага антрацыту ў ПАЗШ і Канаду

ХАРКАЎ, 28. У Нью-Ёрку падпісаны два буйных дагаворы на пастаўку данецкага антрацыту ў ПАЗШ і Канаду, Донвугаль абавязваўся ящчэ ў бягучым годзе экспартаваць у ПАЗШ і Канаду 350.000 тон антрацыту. Гэта—першыя дагаворы, заключаныя трэстам у Амэрыцы, ня гледзячы на процідзейнічаньне Англіі. (ТАСС).

Выкрыты сьледчыя матар'ялы аб дэкабрыстых

БЭРДЫЧОЎ, 24. У сяле Цягун, Бэрдычоўскае акругі, у мясцовай царкве выкрыты сьледчыя матар'ялы аб дэкабрыстых, у прыватнасьці, прыгавор суду, поўны сьпіс усіх абвінавачаемых і рад іншых дак

Павольны тэмп загатоўкі другарадных відаў экспарту

Ставіць пад пагрозу выкананьне пляну

Загатоўчыя арганізацыі вяла адносяцца да загатоўкі другарадных відаў экспарту.—Шырока папулярызаваць на нізох значэньне другараднага экспарту.—Акажам усякую дапамогу і садзейнічаньне зборшчыкам другарадных відаў. — Арганізуецца спаборніцтва і конкурс паміж асобнымі раёнамі.— Трэба максымальна выкарыстаць летні сезон

Ход загатовак ў Беларусі другарадных відаў экспарту пакуль што незадавальняючы. Так паўгадовы плян выкананы Белдзяржгандлем на 44 проц., а Белкаапсаюзам—толькі на 18 проц. Паўгадовы плян па загатоўцы рызьля не перавышае 65 проц.

Пры гэтым трэба адзначыць, што красавік, і першая палова мая не палепшылі становішча—і ў гэтым месяцы фактычная загатоўка далёка адстае ад плянавых заданьняў.

Такое становішча, калі яно будзе так і падалей, можа прывесьці да зрыву нашага экспартнага пляну і да перабояў у забесьпячэньні сырцом нашай прамысловасьці. І таму мы ня можам заставацца спакойнымі пры такім слабым тэмпе загатовак. Трэба пачаць дзейнічаць і энэргічна дзейнічаць.

Устаноўлена, што нашы загатоўчыя арганізацыі адносяцца надзвычайна вяла і нядбайна іменна да загатоўкі другарадных відаў экспарту. Тут атрымліваецца такое ўражаньне—віды другарадныя, ну і ўвага другарадная. Трэба шырока і ўсякімі спосабамі растлумачыць, што другарадныя віды адыгрываюць буйнейшую ролю ў нашым агульным экспартным пляне.

Наркамгандаль зараз націскае на загатоўшчыкаў. За нядбайлівыя адносіны да загатоўкі другарадных відаў сыр-ну абвешчана вымова праўленьню Белдзяржгандлю. Праўленьням Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу абвешчанае папярэджаньне з повану такіх неданушчальных адносін да загатовак. Пры гэтым праўленьням усіх гэтых загатоўчых арганізацый запрапанавана прыцягнуць да адказнасьці тых работнікаў апарату, якія ня выканалі дырэктыў Наркамгандалю па экспартных загатоўках.

Мы тут яшчэ маем ненармальныя адносіны да экспартнай справы Белкаапсаюзу. Апошні, зьяўляючыся галоўным трымальнікам дэфіцытных тавараў і адчуваючы сябе «гаспадаром», адмовіўся выканаць дырэктыву аб вылучэньні часткі дэфіцытных тавараў Белдзяржгандлю і Белсельсаюзу для загатоўкі рызьля. Зараз Белкаапсаюзу запрапанавана ў трохдзённы тэрмін выдаць гэтыя дэфіцытныя тавары.

Трэба ўзмацніць папулярызацыю гэтай справы, прыкаваць да яе ўвагу грамадзкасьці асабліва нізавой, ужываць сыстэму заахвочваньня і прэміяваньня.

Ужо вырашана пытаньне аб арганізацыі спаборніцтва і конкурсу паміж асобнымі раёнамі на лепшы абор і загатоўку другарадных відаў экспарту. Пры гэтым будуць прэміявацца як цэлыя раёны (па два раёны на округу), так і асобныя арганізацыі і паасобныя зборшчыкі. На справу прэміяваньня Наркамгандлем адпускаецца даволі салідная сума—прэмі будуць выдавацца пераважна натураю (вэлёсыпэды, радыёўстаноўкі, імпартныя тавары).

У конкурс і спаборніцтва павінна быць уцягнуты ўся сыстэма каапэрацыі, партыйныя, камсамольскія, грамадзкія і піянэрскія арганізацыі, сельсаветы, жаночы актыў.

У збор другарадных відаў экспарту трэба шырока ўцягнуць інвалідныя арцелі, сматаўную каапэрацыю, сялянскія камітэты ўзаемадапамогі, дапаўненьні ім усякай дапамогі і садзейнічаньня шляхам інструктаваньня, фінансаваньня і г. д.

Паводле папярэдніх вынікаў веснавой пасеўнай кампаніі мы бачым, як многа можна зрабіць пры правільнай агітацыі і папулярызацыі, пры мабілізацыі грамадзкай думкі. Трэба і тут на гэтым важным вучастку нашага гаспадарчага фронту з усёй энэргіяй падцягнуць загатоўку разварушыць грамадзкую думку, націснуць на ўсе надзвычаі—і вынікі зараз-жа выявяцца.

Праўда, зараз у летні адпускны час работа ў некаторых галінах паслабляецца. Але тут мы ня можам дапусьціць ніякага паслабленьня работы. Мы ня можам прамаргаць летні сезон, які яшчэ можа выправіць становішча. І пастае пытаньне аб мэтазгоднасьці ўстанаўленьня такога парадку што працаўнікі загатоўчага апарату могуць атрымліваць водпускі некалькі пазьней—пасьля выкананьня экспартна-загатоўчых плянаў. Трэба думаць, што і ЦСПСБ, прымаючы пад увагу ўсю важнасьць гэтай справы, ня будзе перашкаджаць супроць такога мерапрыемства.

Л. Н.

На глебе канкурэнцыі

(З загатоўчых кур'ёзаў)

Канкурэнцыя на сырцовым рынку ня толькі ня спыняецца, але з кожным днём усё больш расквітае. Брыдкія формы гэтай канкурэнцыі асабліва яскрава выявіліся ў выпадках пераманьваньня прасолаў з аднэй арганізацыі ў другую.

Да загадчыка Аршанскім аддзяленьнем Белдзяржгандлю зьявілася група прасолаў і катэгарычна заявіла:

— Белкаапсаюз адпусьціў прасолам пшанічную муку для выпечкі мацы на вялікдзень, далі кожнаму прасолу па адным пудзе белай мукі. Калі вы ня прымеце рашучых мер да забесьпячэньня час мацой, дык мы кідаем у вас работу і пераходзім у Белкаапсаюз.

Заява прасолаў зрабіла даволі моцнае ўражаньне на загадчыка Аршанскім аддзяленьнем, бо гэты дзікі выпадак аказаўся не анэкдотам, а сапраўднасьцю, бо за тыдзень да вялікадня прасолы, акрамя іншых дэфіцытных тавараў, атрымалі ад Белкаапсаюзу кожны па пудзе пшанічнай мукі 1-га гатунку спэцыяльна для мацы (?!).

Ясна, што іншыя загатоўчыя арганізацыі пазбаўлены ўсялякай магчымасьці змагацца з такімі «мэтадамі» загатоўчай работы. якія даходзяць да задаваленьня «рэлігійных» патрэб прасолаў.

І, сапраўды, апошнія, атрымаўшы «мапавую» муку, перайшлі да спажывецкай каапэрацыі для збору ануч, касьцей і г. д.

У Касьцюковічах (Аршанскі раён) адзін з прасолаў спажывецкай каапэрацыі «затрымаў» свайго калегу з Белдзяржгандлю («на якой падставе ты ўлез у «чужыя» межы!»), забраў у яго дакументы і каня. І толькі праз тыдзень пасьля ўмяшчаньня ў гэту справу акргандлю прасолу Дзяржгандлю ўдалося атрымаць назад дакументы і каня. А ў працягу 7-мі дзён гэты «вінаваты» прасол ня мог сабраць ні фунту сырцу.

Справа гэта разглядалася ў судзе і касьцюковіцкія судзьдзі спынілі справу «з-за нязначнасьці злачынства»...

У Чашніках (Віцебскі раён) група прасолаў у 18 чалавек падала заяву чашніцкаму ўпоўнаважанаму дзяржгандлю аб тым што член праўленьня Чашніцкага спажывецкага таварыства т. Грэк прапануе кожнаму па 3 пуды жыта. і пудзе пшаніцы, па 2 пуды аўсу і 2 пуды вотрубей, каб яны толькі перайшлі на работу да іх... Чашніцкія прасолы «ультыматыўна» паставілі пытаньне і далі 3 гадзіны на разважаньне.

З прычыны таго, што «ультыматум» ня быў прыняты, дык гэтыя прасолы перайшлі ў спажывецкую каапэрацыю, а загатоўкі дзяржгандлю ў Чашніках прыпініліся...

Можна было-б падаць яшчэ цэлы рад такіх яскравых фактаў, але і гэтых даволі, бо яны красамоўна гавораць аб тэй дзікай канкурэнцыі, якая яшчэ існуе паміж загатоўчымі органамі, што прыводзіць да дэзарганізацыі рынку.

Патрэбны энэргічныя меры для зьнішчэньня гэтых брыдкіх зьявішч.

Л. МАНІН.

Каапэрацыя выканала поўнасьцю пляны сеназагатовак

Трэба спыніць сустрэчныя перавозкі

Першая практыка каапэрацыйных сеназагатовак дала нечакана добрыя вынікі. На 1-га красавіка 1929 г. каапэрацыя загатовіла 17.210 тон г. зн. плян сеназагатовак быў выкананы на гэты дзень поўнасьцю

У надыходзячай кампаніі ў БССР каапэрацыя прапануе загатовіць 12.000 пудоў сена пры агульным унутраным таварным звароце ў 5.000.000 пуд. сена ў год (даныя ЦСУ).

Каапэрацыя, такім чынам, адыграе ў сеназагатоўках вялікую ролю. Яна будзе амаль асноўным загатоўшчыкам сена ў БССР, бо Саюзхлеб і інш. арганізацыі фактычна вядуць свае загатоўкі сена праз каапэрацыйную сыстэму.

Для падрыхтоўкі спэцыялістых па сеназагатоўках, беларуская кантора «Саюзхлеба» адкрывае курсы на 15 чал.

Дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі адпушчаны спэцыяльныя крэдыты для абсьледваньня якасьці сена.

У мінулую кампанію дзяржаўная хлебная інспэкцыя ўпярыню вяла работу па інспэктаваньні якасьці сена. Усяго было праінспэктавана за год 4.000 вагонаў.

Дзякуючы гэтаму, некаторыя спажыўцы сена мелі магчымасьць атрымаць скідку на нестандартнае сена, выкрытае інспэктаваньнем дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі. Агульная сума скідак за год склала 3.000 рублёў.

Усе пералічаныя мерапрыемствы дазволяць пашырыць сеназагатоўчую работу і паставіць гэту справу на належную вышыню.

Неабходна таксама прыняць рашучыя крокі да спыненьня сустрэчных перавозак. Адначасова шмат выпадкаў, калі сена з БССР вывозіцца ў іншыя раёны Саюзу і ў той-жа час сена такой-жа якасьці завозіцца з іншых раёнаў у Беларусь.

Гэтыя сустрэчныя перавозкі прыносяць вялізную страту чыгуначнаму транспарту, зусім непатрэбна загружаючы чыгунку і рухомы склад, і гэтым таксама значна падаражаюць кошт самога сена.

Разьвіцьце саматужнай хэмрпамысловасьці

У свой час у «Зьвязьдзе» паведамлялася аб тым, што Белсампрамсаюз прыступае да арганізацыі новага да гэтага часу ў Беларусі сьпірта-парашковага промыслу.

Цяпер работа па арганізацыі гэтага промыслу ўжо амаль набліжаецца да канца. Запрошаны Белсампрамсаюзам спэцыялісты па арганізацыі гэтае справы аб'яжджае цяпер раёны Беларусі і ўстанаўляе найбольш выгодныя месцы для абсталяваньня казанаў.

Да 1-га кастрычніка г. г. будзе абсталявана 100 казанаў.

Белсампрамсаюз зьвярнуўся ў Эканомнараду БССР з халайніцтвам аб водпуску дроў для паказанага промыслу без налічэньня гандлёвай надбавы. Эканомнарада ўжо дала сваю згоду на водпуск дроў без наддачы і, трэба меркаваць, што далейшых перашкод на шляху да арганізацыі сьпірта-парашковага промыслу ў БССР ня будзе.

Белсампрамсаюз заключыў дагавор з Хэмсындыкатам на ўсю прадукцыю сьпіртовага парашка (акрамя вугалю), якая будзе выпушчана ў 1929-30 годзе. Дагавор складае суму 200 000 рублёў.

Патрэбнае жалеза і медзь для абсталяваньня казанаў Белсампрамсаюз атрымае ад ВМС і інш. мэталягандлёвых арганізацый.

У сьпірта-парашковым промысьле будзе занята каля 500 чалавек (100 чалавек непасрэдна, а вытворчасьці і 400 сэзонных рабочых па загатоўцы дроў).

Парадак абслугоўваньня сэзоньнікаў

Цэрабсэкцыя паказала мясцом, што забесьпячэньне сэзонных рабочых хлебам павінна праводзіцца па нормах, ня ніжэй норм, існуючых для норм вытворчых рабочых. Мінімальная норма груп—750 грам у суткі на едака. У залежнасьці ад мясцовых умоў гэта норма можа быць павялічана. Некалькі ніжэй нормы могуць забясьпечвацца сэзоньнікі, якія толькі прыбылі на работу і знаходзяцца на вучоце біржы працы. Аднак, з моманту фактычнага наступленьня на работу, норма падніраецца да вышэйпаказанай.

Да сэзонных рабочых, якія павінны быць забясьпечаны па нормах для вытворчых рабочых аднесены таксама рабочыя калёны Наркампаштэлю, занятыя на сэзонных работах па рамонце і пабудове тэлеграфных і тэлефонных ліній.

Збыт беларускіх смалапродуктаў

ЗАГАТОЎЧЫ ПЛЯН БУДЗЕ АЖЫЦЦЁЎЛЕНЫ ПОЎНАСЬЦЮ

У зьвязку з распачатым будаўнічым сэзонам, павялічыўся на ўнутраным рынку попыт на шкіпінар. Ажыўіўся попыт на шкіпінар, асабліва чырвоны, і з боку замежнага рынку (Аўстрыя).

Што датычыць рынку смалы, дык затрудненьняў у збыце на ўнутраным рынку зараз няма. Белсампрамсаюз забясьпечаны рэалізацыяй смалы да восені.

Загатоўчы плян быў выкананы за першае паўгодзьдзе поўнасьцю. Загатоўлена каля 2.500 тон смалы і каля 1.300 тон шкіпінару.

Такая-ж колькасьць прадугледжана плянам Белсампрамсаюзу і на другое паўгодзьдзе.

Усекалесу на гэты пэрыяд (другое паўгодзьдзе) прадана 1.200 тон шкіпінару і 2.400 тон смалы на 663.000 руб.

Трэба меркаваць што намечаная плянам колькасьць будзе загатоўлена з перавышэньнем.

Да кастрычніка месяца Белсампрамсаюз мяркуе абсталяваць 50 новых каталаў каапэрацыі да 50 саматужнікаў-смалакураў Якасьць смалапродуктаў палепшылася.

За калектыўнае хаваньне аблігацый

СЛУХАЙЦЕ „Бальшавік" і „Беларусь", гаворыць „Чырвоная Зара"

Пазаўчора адбыўся агульны сход рабочых і служачых менскага заводу «Чырвоная Зара».

Сход заслухаў інфармацыю аб задачах і значэньні другой пазыкі індустрыялізацыі.

Рабочыя і работніцы, што выступалі ў спрэчках, аднадушна выказаліся супроць датэрміновага збываньня аблігацый.

Сход прыняў выклік менскага хлебазаводу здаваць аблігацыі на калектыўнае хаваньне і прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца:

— Ні адна аблігацыя не павінна быць прадана, ці закладзена бяз ведама заўкому.

— Даручыць камісіі садзейнічаньня другой пазыкі індустрыялізацыі здаць усе аблігацыі ў ашчадную касу на калектыўнае хаваньне, заклікаць усіх рабочых і работніц здаць камісіі свае аблігацыі.

— Выклікаць заводы «Бальшавік» і «Беларусь» пасьледаваць прыкладу рабочых «Чырвоная Зара».

Камвузаўцы выклікаюць усе навучальныя ўстановы

Агульны сход студэнтаў Камунуніверсытэту Беларусі імя У. І. Леніна і курсантаў дзённых курсаў камсамольскага актыву, заслухаўшы інфармацыю т. Бераловіча аб калектыўным хаваньні аблігацый 2-й пазыкі індустрыялізацыі, лічыць, што выкананьне асноўнай генэральнай лініі нашае партыі па індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, а таксама ліквідаваньне тых труднасьцяй, якія зьвязаны з выкананьнем 5-цігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі, немагчыма бяз шырокага ўдзелу шырокіх працоўных мас насельніцтва і іх дапамогі ў гэтым.

Сход пастанавіў калектыўна здаць аблігацыі 2-е пазыкі індустрыялізацыі на хаваньне ў банк, заклікаючы да гэтага ўсіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў Камвузу. Адначасова праз друк выклікаем пайсьці на напшым прыкладзе ўсе навучальныя ўстановы г. Менску і БССР.

Сэзоньнікі не павінны адстаць

Сэзонныя рабочыя, якія прадстаўляюць у сваёй асноўнай масе часова прыходзячае ў горад сельскае насельніцтва, у зьвязку з несупаданьнем часу кампаніі па падпісцы з пэрыядам сэзонных работ, ня мелі магчымасьці падпісацца на пазыку адначасова з усімі арганізаванымі рабочымі. Таму зараз праводзіцца сярод іх спэцыяльная кампанія.

У часе будаўнічага сэзону сярод іх адкрываецца падпіска і продаж аблігацый 2-е пазыкі індустрыялізацыі на асобных ільготных умовах. Кампанія па падпісцы сярод усіх рабочых прахо дзіла пад лёзунгам **«месячны заработак пазычым дзяржаве».** Сэзоньнікі павінны даць дзяржаве двухтыднёвы заработак. Яны не павінны адстаць ад арганізаваных рабочых, як і пастаянныя грамадзкія рабочыя, яны павінны паказаць, і, трэба думаць, пакажуць, што ім блізкі інтарэсы індустрыялізацыі. Яны прымуць удзел у вялікай будоўлі ня толькі сваёй працай, але і сваімі вольнымі сродкамі.

Асноўную работу сярод сэзоньнікаў па папулярызацыі і падпісцы на пазыку праводзяць камісіі садзейнічаньня а там, дзе іх няма, прафсаюзная ячэйка на месцы сэзонных работ.

Продаж аблігацый праводзіцца па біржавой цане, што прадстаўляе сабой скідку, спэцыяльна ўвадзімую для сэзоньнікаў. У тых выпадках, калі сэзоньнікі застаюцца на рабоце на працягу нядоўгага часу, або калі цякучы склад, продаж праводзіцца за наяўны разьлік. У іншых выпадках продаж праводзіцца ў растэрміноўку.

Растэрміноўка даецца на той тэрмін, на працягу якога сэзоньнік будзе заняты на працы. Утрымліваюцца грошы за аблігацыі пры выдачы заработнай платы роўнымі часткамі. Калі сэзоньнікі пакідаюць работу да поўнай аплаты аблігацый, дык ім даецца права неадкладнага атрыманьня цалкам аплачаных аблігацый і адмаўленьня ад неаплачанай сумы аблігацый.

У выпадках жаданьня ад'яжджаючых сэзоньнікаў дасьлаць з месца сталага жыхарасьтва сумы, якое не хапае да поўнае аплаты яго аблігацый, ім даецца для гэтага тэрмін на працягу 3-х месяцаў. Па атрыманьні гэтай сумы сэзоньніку дармова дысылаюцца аблігацыі па пошце па паказаным ім адрасе.

З моманту ўнясеньня першага ўзносу за набытыя ў растэрміноўку аблігацыі сэзоньнік атрымлівае права на даход ад аблігацый (проц. і выйгрыш) пры гэтым адміністрацыяй, або камісіяй садзейнічаньня выдаецца кожнаму падпісчыку квіток з паказаньнем нумароў, замацаваных за ім аблігацый.

РАБЦЭВІЧ.

Сацыялістычнае спаборніцтва

НЕ ЗАБЫВАЙЦЕСЯ ПРА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ

МЕНСКІ ХЛЕБАЗАВОД ВЫПЯКАЕ СЫРЫ ХЛЕБ

ПАСЬЛЯ УРАЧЫСТЫХ АБЯЦАНЬНЯЎ І ПАДПІСАНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ДАГАВОРУ

РЭКОРДЫ НАМЕЧАНЫ

Менскі хлебазавод заключыў дагавор з хлебазаводам Магілеву аб сацыялістычным спаборніцтве. Акрамя таго Менскі хлебазавод рыхтуе дагавор з ленінградзкімі і маскоўскімі хлебазаводамі.

Па дагаворы з Магілеўскім хлебазаводам менскія пякары абавязаліся да 1-X-29 г. зьнізіць сабекошт прадукцыі на 18 проц., выканаць праграмныя заданьні на 130 проц, зьнізіць прагулы, **узьняць якасьць прадукцыі,** з'эканоміць ня менш 8 проц. апалу, зьнізіць агульна-заводзкія выдаткі на 20 проц., настольки-ж узьняць прадукцыйнасьць працы, і г. д.

Ужо ёсьць некаторыя дасягненьні. Напрыклад, выпечка калача павысілася на 30 проц., французкіх булак—на 12,5 проц., баранак—на 15 проц.

Ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, група таварышоў булачнага цэху падала заяву аб паўторным добраахвотным узьняцьці норм на 10 проц. Да іх далучыўся ўвесь цэх. Асобныя рабочыя бараначнага цэху таксама падалі заявы аб узьняцьці норм на 10 проц. Цукерны цэх павышае на 3—6 проц.

Паступова, шляхам індывідуальных і цэхавых выклікаў, уцягнуты ў сацыялістычнае спаборніцтва ўсе рабочыя, пачынаючы з вучняў і канчаючы старшымі майстрамі.

Асноўная маса рабочых прымае актыўны ўдзел ва ўсёй грамадзкай рабоце прадпрыемства, асабліва ў вытворчых нарадах. У насьцянгазэту пачалі пісаць тыя, хто ніколі ня пісаў.

Але разам з гэтымі станоўчымі моментамі ёсьць рад адмоўных, якія могуць прынесьці вялікую шкоду прадпрыемству.

АСНОЎНАЕ ЗРАБІЛІ

У пагоні за рэкордамі рабочыя пачалі забываць аб якасьці прадукцыі. І гэта пачынаюць адчуваць найшчыкі МЦРК, якія ядуць хлеб менскага хлебазаводу. Асабліва гэта датычыць **мясільнага аддзяленьня** Тут часта бывае, што сьпяшаюцца і замешваюць цеста бяз солі, стараюцца , як мага больш замясіць, не зварачаюць увагі на якасьць квасу, ад якога залежыць якасьць хлеба.

Ня лепш працуе **пякарня.** Там часта хлеб у печы трымаюць на 5-8 хвілін менш, чым трэба, і хлеб выходзіць сыры. Або печы перагараюць, каб хлеб хутчэй сьпячы. Таму зьверху і зьнізу хлеб падпальваецца, а ў сярэдзіне хлеб сыры.

Яшчэ горш абстаіць справа ў **бараначным цэху.** Там качагары часта скарыстоўваюцца на тых работах, ад якіх залежыць большая выпрацоўка прадукцыі, а печ-канвэр астывае і баранкі атрымліваюцца падсушанымі. Кацёл у бараначным цэху рэдка мыецца, і баранкі гатуюцца не ў вадзе, а ў густым навары, прычым ад гэтага навару нясе кіслым пахам.

Машыны ў цэху запушчаныя, брудныя. На іх зрабілася скарынка ад засохшага цеста. Ад апуч, якімі пакрываецца цеста, нясе едкім пахам, бо яны ніколі ня мыюцца. Фіцельны пас папсаваўся. Таму часта цеста падае на падлогу, а рабочыя, ня гледзячы на гэта, пякуць з яго баранкі.

ПРАЦДЫСЦЫПЛІНА ЎСЁ ЯШЧЭ КУЛЬГАЕ

Ня зжыты палкам таксама парушэньне працдысцыпліны, п'янства і бойкі ў часе работы. Толькі гэтымі днямі быў звольнены за п'янства і 5 прагулаў рабочы **Мароз.** Ёсьць выпадкі спазьненьня на работу, асабліва ў гэтым практыкуюцца рабочыя **Зэльцар і Бацьвіньнік.** Нядаўна сьлесар **Галынец,** кандыдат партыі, паспрачаўся з рабочым Ледвічам і абліў яго гарачай гарбатай.

У бараначным цэху цэлы дзень тольні і чутны лаянкі. Работніцы **Жук, Руман і Мінніна** за лаянкі атрымалі ад заўкому вымову. Работніца **Шустэрман** за тое, што яе не паслалі ў дом адпачынку, дрэнна адносіцца да работы і лае праўленьне ЦРК, ячэйку і заўком...

Усё гэта адбіваецца на якасьці хлеба.

Гэта гаворыць за тое, што ня ўсе рабочыя менскага хлебазаводу зразумелі, якое вялікае значэньне павінна мець сацыялістычнае спаборніцтва на ўмовах хлебазаводу. Трэба ня толькі ўзьняць прадукцыйнасьць працы і зьнізіць сабекошт прадукцыі, **але-ж даць у першую чаргу такую прадукцыю, каб на яе не скардзіўся спажывец.**

На гэтую акалічнасьць сацыялістычнага дагавору рабочыя Менскага хлебазаводу павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

У ПАГОНІ ЗА РЭКОРДАМІ

Ёсьць яшчэ адзін цікавы момант.

У пагоні за рэкордамі некаторыя рабочыя пачалі працаваць больш 8-мі гадзін у дзень. Зразумела, такі падыход да спаборніцтва зьяўляецца недапушчальным.

У бараначным цэху, напрыклад, майстар цэху **Казлоў** некалькі раз з усёй сваёй брыгадай пачынаў работу на паўгадзіны раней. Майстар **Палтэр** сыстэматычна перад сканчэньнем работы наўмысьля замешваў шмат цеста і такім чынам прымушаў брыгаду працаваць больш 8-мі гадзін. Такі-ж выпадак падаўжэньня рабочага дня на 20 хвілін меў месца на брыгадзе майстра Хоніка. Работніцы-варыльшчыцы і цэхавыя майстры ва ўсіх брыгадах амаль увесь час падаўжылі 8-мігадзінны рабочы дзень.

Спаборніцтва павінна ісьці ў рамках 8-мігадзіннага рабочага дня. А хто гэтага не разумее, той наогул нічога не разумее ў пытаньнях арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

С—я. С. Х.

ПА ВОЛІ ХВАЛЬ

Сацыялістычнае спаборніцтва на заводзе імя Домбаля ня сустрэла падтрыманьня заводзкіх арганізацый

Ня гледзячы на тое, што завод імя Домбаля ўжо больш як месяц прыняў выклік і ўступіў у спаборніцтва, практычна праведзена вельмі мала.

Стварыўшы ў пачатку штаб кіраўніцтва спаборніцтвам, яго без сялякіх падстаў распусьцілі, а кіраўніцтва спаборніцтвам узяў на сябе заўком. Але наш заўком вельмі заняты, у яго шмат іншых важных пытаньняў для вырашэньня, таму ён спаборніцтву ўдзяляе вельмі мала ўвагі.

Прайшоў месяц, а аб выніках спаборніцтва рабочыя ня ведаюць. Дошкі, якія былі загатоўлены для вядзеньня «дзеньнікаў спаборніцтва», спакойна стаяць у памяшканьні, а пастанова агульнага ходу аб штодзённым інфармаваньні рабочых аб ходзе спаборніцтва ня выконваецца.

Падлік работы заводу вядзецца толькі ў агульным заводзкім мантабе, а падлік работы па цэхах, па варштатах і па калектывах, якія пачалі спаборніцтва, не вядзецца. Зразумела, што гэта не дае магчымасьці рабочым сачыць за вынікамі спаборніцтва.

Цягнульшчыкі зьмены дзесятніка Лукашэвіча выклікалі цягнульшчыкаў дзесятніка Грушэўскага і Эпштэйна, ставячы сабе задачай палепшыць пракалку. Паменшыць глум, зьнішчыць прагулы. Рэзчык шклянак Салкевіч выклікаў на спаборніцтва Клачко і Вабіцкую. Яны паставілі сабе мэтай давесьці выпрацоўку да 10.000 шклянак, палепшыць якасьць і паменшыць да мінімуму процант глуму.

Але абодвы гэтыя выклікі абяцаньваюцца без арганізацыі дакладнага падліку штодзённай выпрацоўкі, бяз шырокага абвяшчэньня вынікаў спаборніцтва паміж цэхамі і варштатамі.

Заводзкія арганізацыі амаль што нічыя аб спаборніцтве не правялі. У некаторых асобных рабочых ёсьць вельмі нездаровыя адносіны да спаборніцтва. Яны расцэньваюць спаборніцтва, як нашіск на рабочага, як пустую забаву. І ніхто ім не растлумачыў, як груба яны памыляюцца.

Часткова такая-ж думка была ў некаторых рабочых на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна». але там уся рабочая маса на прыкладзе паказала ўсю недарэчнасьць і неўгрунтаванасьць падобных поглядаў.

За першы-ж месяц спаборніцтва рабочыя «Чырвонай Бярэзіны» дабіліся павялічэньня выпрацоўкі з 1.282 каробак запалак на аднаго рабочага да 1.359 каробак. Палепшылася працдысцыпліна і зьнікаюць прагулы па нягрунтоўных прычынах з 0,55 проц. да 0,35 проц. але і па «Чырвонай Бярэзіне». як і на заводзе імя Домбаля не разгарнулася спаборніцтва паміж цэхамі і першыя вынікі спаборніцтва слаба папулярызуюцца сярод рабочых.

ДОМБАЛЕВЕЦ.

ЧАМУ ЯНЫ МАЎЧАЦЬ?

Гута „Камінтэрн" не адказвае на лісты гуты імя Домбаля

Гута «Камінтэрн» праявіла добрую ініцыятыву і выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва гуту імя Домбаля. Здавалася, што ініцыятары павінны штурхаць гэту справу да канца. А, мусіць, гэта пра іх, пра ініцыятараў «Камінтэрну», сказана, каб не займацца парадным спаборніцтвам. Выклікалі яны гуту імя Домбаля і супакоіліся.

Свой выклік яны зрабілі праз газэту. Гэта ня дрэнна, але роўналежна з гэтым трэба было прысылаць ліст з указаньнем умоў спаборніцтва. Домбалеўцы чакалі листу, але не дачакаліся. Тады домбалеўцы парашылі прыняць выклік і самі паслалі ліст рабочым «Камінтэрну» з просьбай умовіцца аб далейшых кроках на наладжаньні спаборніцтва.

Прайшоў некаторы час — ад камінтэрнаўцаў ні слова.

Тады рэдкалегія друкаванай газэты «Домбаля» «Гута» спрабавала завязаць з рэдкалегіяй насьцянгазэты заводу «Камінтэрн» і фабкомам дыплёматычныя адносіны. Былі пасланы на гуту «Камінтэрн» газэты, якія адлюстроўвалі, як гута імя Домбаля пачынае на практыцы праводзіць у сябе сацыялістычнае спаборніцтва.

Зноў прайшоў некаторы час і зноў камінтэрнаўцы нічога не адказалі.

І вось хочацца запытацца ў таварышоў з «Камінтэрну»: **«куды варта такая работа?».**

Між тым абмен практыкай паміж гэтымі дзьвюма гутамі можа даць шмат карысьці. Мы ведаем, што на абедзьвюх гутах ёсьць некаторыя дасягненьні і было-б цікава ведаць, якім шляхам гуты да гэткіх дасягненьняў прыйшлі. Тое-ж самае датычыць і недахопаў у рабоце.

Таварышы камінтэрнаўцы, калі вы адлажэце на лісты рабочых гуты імя Домбаля?

У. ЛІСЕВІЧ.

Менскія дрэзаапрацоўшчыкі заключаюць сацыялістыч. дагавор з дрэзаапрацоўшчыкамі Кіеву

Гэтымі днямі з Менску выехала на Украіну дэлегацыя рабочых заводу «Дрэзаапрацоўшчык» для заключэньня дагавору па сацыялістычным спаборніцтве з рабочымі-дрэзаапрацоўшчыкамі гор. Кіеву.

Менскія рабочыя выстаўляюць наступныя пункты: поўнае выкананьне дырэктывы партыі аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Дэлегацыя ў час свайго побыту на Украіне азнаёміцца з пастаноўкаю тэхнікі працы на украінскіх дрэзаапрацоўчых заводах.

Не пасылайце ў Менск гнільля

(Аб рабоце загатоўчых органаў)

Калі нашы загатоўчыя органы пасылаюць у Менск які-небудзь тавар, дык яны робяць, як кажа прыказка: «Далей вочы, лягчэй сэрцу». Іх ня цікавіць: тавар мокры, ці гнілы, а пасылаюць яго —няхай галаву ламае той, хто будзе яго ўпарадкаваць, хто будзе яго сартаваць.

А калі тавар прыбывае ў Менск, дык прыходзіцца амаль выкідаць яго на сьметнік.

Зімою здавалі Белкаапсаюз і Белсельсаюз Белдзяржгандлю пушніну. І вось, што ні партыя—усё сырыя скуры. Ну, ці-ж можна пасьпець высушыць вялікія партыі пушніны, калі нават сушылкі няма?

Калі дзяржбракер пазваніў па тэлефону ў Белкаапсаюз, што 50 каціных скур трэба выкінуць, дык Белкаапсаюз адказвае: «Гэта-ж ня ў нас згніло, гэта здарылася на складзе Белдзяржгандлю, дык пры чым мы тут»... А потым пытаюцца: «А колькі гэта грошай?» Бракер кажа: «Ну, рублёў 50»...—«Ах, 50 рублёў, ну гэта дробязь»...

Гомельскае аддзяленьне Белдзяржгандлю прыслала вагон рызьля ў Менск на рызьзёвую базу. Як адкрылі зьвязкі, дык аж пара шуганула. Гарачыня такая, што нельга было руку трымаць. Тлумачыцца гэта тым, што рызьзё адаслалі мокрае, добра запрасавалі і яно ў дарозе згарэла.

Белпапертрэст прыслаў аднойчы на базу Дзяржгандлю 125 мех вырачных канцоў. Палову трэба было выкінуць на двор, бо аказалася адно сьмецьце.

Трэба ў далейшым усе гэтыя памылкі зьнішчыць, каб ня трапіўся купец на скуры сабак і катоў, якога ў дзень са сьвечкамі шукалі, малго-б згарэць 100.000 рублёў.

Г. МАЗО.

Чэрвеньская дэманстрацыя супроць імпэрыялістычнае вайны ў 1917 г.

(Асабістыя ўспаміны)

Уладзімер Ільліч Ленін у гэту эпоху ўвесь час ня толькі прымаў чыны ўдзел, але ўласна кіраваў усёй работай ЦК і ПК бальшавікоў, імкнучыся рабіць асноўную сваю справу растлумачыць пралетарыяту яго памылкі, для чаго ён карыстаўся рашуча кожным крокам супраціўніка.

Досыць было меншавіком праклямаваць дэманстрацыю пралетарыяту пад відам «працэсіі на могілкіахвяр рэвалюцыі», якую яны назначылі на 18 чэрвеня, у той дзень, калі авантурнік Керанскі кінуў частку расійскага войска ў наступленьне, каб Уладзімер Ільліч зараз-жа парашыў гэту дэманстрацыю праціў абярнуць у сапраўдную дэманстрацыю супроць Часовага Ураду і ўсіх яго прысьпешнікаў, у тым ліку і супроць меншавікоў і с.-р.

Меншавікі і эсэры зразумелі, што нельга больш маўчаць маса, калі зноў кідаюць дзесяткі тысяч салдат на забойства на фронт імпэрыялістычнае вайны, і яны і самі толькі сем дзён таму назад з пенаю на вуснах абаранялі перад саветам лёзунг забароны дэманстрацыі, абвешчанай бальшавікім ЦК на 10 чэрвеня з повану падрыхтоўваемага Керанскім наступленьня,—цяпер яны самі забегалі па раёнах, запрашаючы ўсіх на спозьненую дэманстрацыю, у сутнасьці з таго-ж повану, які раней за іх прадугледзілі і высунулі бальшавікі. Уладзімер Ільліч самым энэргічным спосабам налягаў на абярненьне гэтай мірнай дэманстрацыі ў дэманстрацыю-пратэсту супроць абвешчанага наступленьня на фронце. За мір, супроць вайны, за Саветы, супроць Думы, супроць саюзьнікаў, супроць капіталістых і імпэрыялістых усіх краін... Ён пісаў лёзунгі, пасылаў ва ўсе бакі правяраць, ці сапраўды загатоўлены надпісы, плякаты, сьцягі... Патрабаваў, каб усяго загатоўленага было шмат, каб бальшавіцкія лёзунгі засланілі ўсе іншыя, каб было загатоўлена шмат прамоўцаў, натхняючых лёзунгаў: «Проч вайну, няхай жыве мір» і сам запісаўся і сьпісе прамоўцаў на Марсавым полі. Ён таксама клапаціўся аб карэспандэнцыях для прэсы, даваў ім патрэбныя інструкцыі, навучаў іх. Складаў тэлеграмы ў правінцыю,—адным словам, разьвіваў сваю нязвычайную энэргію, усіх падштурхваў, усіх бадзёрыў, усіх арганізаваў, правяраў і кіраваў.

Дэманстрацыя 18-га чэрвеня прайшла выключна пад лёзунгам бальшавікоў. У дэманстрацыі прымалі ўдзел ня толькі рабочыя, але і вайсковыя часьці. Яна зрабіла чялізнае ўражаньне на ўсіх, бо ясна паказвала на моцнае палявеньне мас і на арганізаванае імкненьне правяць адкрытую актыўнасьць бальшавіцкім Петраградзкім камітэтам нашае партыі і цесна зьвязаных з ёю, чы

У Савеце Народных Камісараў

Мерапрыемствы па замене сахі плугам

Для ажыццяўленьня задачы замены сахі плугам ў сельскай гаспадарцы БССР, асабліва ў паўночных акругах —Віцебскай і Полацкай (апроч 3 раёнаў: Асьвейскага, Ракішанецкага і Дрысенскага), у сумежных 4-х раёнах Менскай акругі (Плешчаніцкім, Бягомльскім, Лагойскім і Халопеніцкім) і ў 2-х раёнах Аршанскай акругі (Багушэўскім і Чарэйскім), Савет Народных Камісараў прызнаў неабходным узмацніць працу ў раёнах, дзе саха ўжываецца замест плуга, уцягваючы бядняцкае і сераднякцкае насельніцтва ў калгасы і іншыя віды вытворчай кааперацыі, праз якія павінна праводзіцца закупка с.-г. інвэнтару: у гэтых раёнах павінна быць пашырана сетка пракатных пунктаў з большаю колькасьцю плугоў і акучнікаў; у раёны з значнаю колькасьцю сох павінны накіроўвацца большыя крэдыты для закупкі плугоў і акучнікаў; у мэліярацыйным пляне павінна быць прадугледжана правядзеньне сухой мэліярацыі,—збор каменьня і інш. у раёнах з камністаю глебаю; адпаведныя ўстановы, у першую чаргу тыя, якія займаюцца будаўніцтвам, павінны заняцца пытаньнем аб скарыстаньні зьбіраемага каменьня для будаўніцтва, а таксама павінны разгарнуць агітацыю па скарыстаньні каменьня для будаўніцтва самім насельніцтвам.

СНК пастанавіў правесьці з 15 чэрвеня г. г. месячнік прасоўваньня плуга і акучнікаў у раёны, дзе ўжываецца саха.

НК Земляробства акруговым і раённым выканаўчым камітэтам запрапанава на ўнесьці, дзе гэта патрэбна, у аграмінімум мерапрыемствы па замене сахі плугам і збору каменьня на пасеўных плошчах. НК Земляробства павінен праверыць прыгоднасьць плугоў новага тыпу, што вырабляюцца Мэталётрэстам, для работы ў розных раёнах БССР.

НК Земляробства разам з НКФ запрапанавана распрацаваць пытаньне аб прэміяваньні за пасьпяховы збор каменьня.

НК Земляробства даручана ў тыдневы тэрмін падаць на зацьверджаньне канчатковы плян практычных мерапрыемстваў для замены сахі плугам у сельскай гаспадарцы БССР.

Пабудова вадаправоду ў Воршы

СНК дазволіў Аршанскаму гарсавету пачаць у 1928-29 г. работы па пабудове вадаправоду, забясьпечыўшы пабудову належнымі рабочымі праектамі і кашторысамі. Згодна эскізнага праекту кошт пабудовы вадаправоду прыняты арыентыровачна ў суме 450.000 руб. СНК прызнаў неабходным, каб пабудова вадаправоду ў Воршы была скончана на працягу 1930 г.

Пабудова хэміка-тэхналёгічнай лябараторыі

СНК пастанавіў арганізаваць для абслугоўваньня задач Інстытута прамысловасьці і Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна хэміка-тэхналёгічную лябараторыю. Арганізацыйнаму Камітэту па арганізацыі Інстытуту Прамысловасьці даручана далажыць СНК плян і агульны праект пабудовы гэтай лябараторыі з разьліку пачаць пабудову яе яшчэ ў гэтым годзе, а таксама вырашыць пытаньне і аб месцы пабудовы лябараторыі.

Экспэдыцыя Беларускае Акадэміі Навук

31-га мая вярнулася ў Менск этнаграфічная і дылекталёгічная экспэдыцыя Беларускай Акадэміі Навук ў складзе акад. **Ластоўскага** (этнаграфія), Некрашэвіча (дылекталёгія) і фотографа-мастака Гальмаджаяна, якая выяжджала для дасьледваньня м. Семяжава, Бабруйскае акругі.

Экспэдыцыя прабыла ў Семяжаве 2 дні і сабрала шмат матар'ялаў. М. Семяжава і яго ваколіцы славяцца тым, што ў мінулым пастаўлялі прафэсыянал-скамарохаў і жанглёраў, якія з сваімі мядзьведзямі і рэпэртуарам абыходзілі ня толькі славянскія, але і нямецкія краіны.

Апрача таго, Семяжава славілася цэхам краўцоў. М. Семежава было таксама асяродкам славутага на ўсю Случчыну і Навагрудчыну цэху старцоў.

Экспэдыцыі не ўдалося запісаць тэкстаў п'ес скамарохаў, але за тое ўдалося сфатаграфаваць некаторыя перажыткі іх у форме калядных гульняў, між іншым «дзеяньне з канём».

Аб цэху краўцоў удалося знайсьці даволі нязначныя гістарычныя даныя, з якіх відаць, што яшчэ ў 70-х гадох мінулага стагодзьдзя цэх краўцоў ужо быў у Семежаве.

Што датычыць старэчага цэху, то памяць аб ім у Семежаве засталася даволі ясная. Ёсьць некалькі грамадзян, якія ведаюць мову гэтага цэху.

Але найбольш цікавым зьяўляецца бытавая асаблівасьць як м. Семежава, так і ваколічных вёсак—Падмажжа, Ляхі і інш.,—што сяляне мыюць два разы ў год лугам і шаруюць жарствой знадворныя сьцены вясковых хат. Дзякуючы гэтаму старыя хаты выглядаюць сьветла-жоўтымі, як быццам вылітымі з воску. Унутры хаты сьцены, столь (звычайна гладкая падбітая дошкамі) і падлогу мыюць такім самым спосабам перад кожным сьвятам. Уваходзячы ў хату, вы бачыце перад сабой ня толькі славутую галяндзкую чыстату, але і асьляпляючую бялізну.

Амаль на кожным дварэ маюцца насланыя тротуары, якія вядуць ад хаты да хлявоў, і ўтрымліваюцца ў бездакорнай чыстаце.

Семежава выбрабляе надзвычайна многа добрага хатняга палатна. Удзельнікі экспэдыцыі наглядалі процэс бяленьня палатна, калі ўздоўж берагоў рэчкі «Удавы» працавала да 300 жанчын.

З Семежава экспэдыцыя выехала ў м. Капыль.

Капыль у мінулым быў цэнтрам ткачоў, краўцоў і ганчароў. У пачатку XIX ст. у Капылі было да 600 чалавек, якія займаліся выключна ткацтвам, яшчэ і цяпер там ёсьць 2 варштаты, на якіх працуюць даўнейшыя цэхавыя майстры. У аднаго з іх Язэпа **Шкадароўча** экспэдыцыя набыла дужа цікавую дошчачку, якую пасылалі з хаты ў хату, ад майстра да майстра, калі трэба было склікаць цэхавы сход. Дошчачка датавана 1816 г.

Далей экспэдыцыя праехала на Валошын, Пясочнае, Койданава.

Экспэдыцыя закупіла некалькі дзесяткаў нумароў усялякіх экспанатаў, пераважна з народнага мастацтва. Між іншым набыта 17 рошваў, вышываных гладзьдзю на кужэльным палатне, якія будуць выданы асобным альбомам.

Апроч гэтага, набыты жаночы сіні жупан старасьвецкага крою, некалькі дзесяткаў паясоў, некалькі старадрукаваных кніжак, пячатка бронзавая, праўдападобна XI-XIII ст., якая вымагае дасьледваньня палеографаў і сфрагістаў. Экспэдыцыя з'фатаграфавала 78 аб'ектаў з народнага мастацтва, быту і матар,яльнай культуры.

МЕНСК



Гмахі Унівэрсітэцкага гарадка скідаюць рыштаваньні

Пленум ЦБ пралетстуду

На 14 чэрвеня склікаецца чарговы пленум пралетстуду. У парадку дня стаяць наступныя даклады: Справаздача прэзыдыуму ЦБ пралетстуда, даклад Наркамасьветы і Галоўнаукі і інш. На пленум выклікаецца старшыня студкому Горацкай с.-г. Акадэміі і інш. вышэйшых навучальных устаноў.

Пленум ЦСПСБ

Чарговы пленум ЦСПСБ склікаецца ў Менску 10-га чэрвеня. Пленум заслухае даклад інструктара УсеЦСПС аб выніках агляду работы прафсаюзных выніках агляду работы прафсаюзнай арганізацыі Беларусі, аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва і выніках агляду працы вытворчых нарад, аб культурна-масавай рабоце прафсаюзаў (клюбы і чырвоныя куткі).

Каналізацыя
(У камунальнай сэкцыі гарсавету)

Камунальная сэкцыя Менскага гарсавету азнаёмілася з ходам каналізацыйных работ у Менску.

Работы забясьпечаны будаўнічымі матар'яламі поўнасьцю за выключэньнем цэмэнту. У апошні час каналізацыйныя работы вядуцца па Гарбарнай вуліцы, на палёх фільтрацыі, насосная станцыі і інш. Прыступлена да дамовай каналізацыі. Усе работы ўвязаны з плянамі Эльводу і часткова трамвайнага кіраўніцтва. На іх занята некалькі сот чалавек.

Сэкцыя прызнала патрэбным, каб да 1-га студзеня 1930 году да вулічнай сеткі было далучана ня менш 70 домаўладаньняў.

Павінны быць прыняты меры да таго, каб каналізацыя пачала функцыянаваць не пазьней 1-га лістапада г. г.

Калі спыняцца непарадкі з водпускам малака?

Пры водпуску малака пайшчыкам з крам ЦРК наглядаюцца вялікія непарадкі. Так, бэтоны, у якіх прывозяць малако, нямытыя. Часта малако прывозіцца раней, чым адкрываюцца крамы, і яно ад награваньня сонца пачынае пракісаць. Былі выпадкі, калі малако прывозілася кіслае.

Ня лепш стаіць справа і з разьмеркаваньнем талёнаў на малако. Пры выдачы іх не аддаюць перавагі маткам, што маюць грудных дзяцей, для якіх у першую чаргу трэба адпускаць малако, а між тым шмат такіх матак засталося без талёнаў.

Менскае ЦРК павінна ўсе гэтыя дэфэкты зьнішчыць.

За дзень

— НА ЎСЕСАЮЗНЫ АНТЫАЛКАГОЛЬНЫ ЗЬЕЗД выехалі ў Маскву дэлегаты Менску, Віцебску і Гомелю для ўдзелу ў рабоце ўсесаюзнага антыалкагольнага зьезду. Ад Менскай арганізацыі т-ва па барацьбе з алкагалізмам на зьезд выехаў інспэктар аховы здароўя тав. Нісэнбаум.

— УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ПРАФТЭХНІЧНАЙ АСЬВЕЦЕ. Наркамасьветы склікае на 14 чэрвеня ўсебеларускую канфэрэнцыю па прафтэхнічнай асьвеце. На абвестцы дня: задачы прафтэхасьветы ў зьвязку з пяцігодкай, навучальныя пляны і інш. Канфэрэнцыя працягнецца тры дні.

— ДОМ АДПАЧЫНКУ Ў ВОЎЧКАВІЧАХ. З 15-га чэрвеня ў Воўчкавічах адкрываецца дом адпачынку для батракоў і лясных рабочых. На працягу сэзону праз дом адпачынку будзе прапушчана каля 300 чалавек. Абсталяваны спэцыяльны пакой для дзяцей батрачак на 10 чалавек.

****

Слухайце радыё-перадачы

Менскай радыё-тэлефоннай станцыі імя СНК БССР на хвалі 949, 6 мэтр.

НЯДЗЕЛЯ, 2-га ЧЭРВЕНЯ

9-00—10-00—Сялянская радыё-газэта з антырэлігійнай старонкай.
10-00—10-30—Сьпявайце разам з намі.
10-30—12-00—Сялянскі канцэрт.
17-00—17-55—Час піянэра і школьніка.
18-00—18-35—Камсамольская радыё-газэта «Чырвоная Зьмена».
18-35—19-20—Лекцыя рабоча-сялянскага радыё-унівэрсытэту па паліт. прадметах.
19-20—20-10—Музычна - літаратурная часопісь з удзелам аўтараў.
20-30—23-00—Канцэрт.

ПАНЯДЗЕЛАК, 3-га ЧЭРВЕНЯ

18-00—18-45 — Пасьляабедзены канцэрт. Струнны акрэстр—10 хв. 2) Фельетон—10 хв. 3) Гумар—10 хв. 4) Клясычная музыка—15 хв.
18-45—19-00—Гутарка аўтодору,—тав. Іванова.
19-00—19-25—Навуковыя экспэдыцыі па Беларусі праф. Смоліч.
19-25—20-15—Беларуская радыё-газэта.
20-30—23-30—Трансьляцыя Ленінграду або канцэрт са студыі.
23-30—Агляд заўтрашняй прэсы.

У калгасы

Беларускі пісьменьнік З. Бядуля выяжджае ў калгасы Меншчыны для азнаямленьня з іх жыцьцём і бытам. У калгасах пісьменьнік будзе зьбіраць матар'ял для другога тому раману «Язэп Крушынскі». Першы том раману ў выданьні Белдзяржвыдавецтва выходзіць з друку праз пару тыдняў.

Забесьпячэньне старых рабочых

Галоўсацстрах Беларусі вывучае пытаньне аб парадку правядзеньня ў жыцьцё закону саюзнага ўраду адносна забесьпячэньня старых рабочых.

Згодна гэтага закону ўводзіцца забесьпячэньне старых рабочых—чыгуначнікаў і мэталістых, якія пакінулі работу па найме пасьля 1-га студзеня 1929 году, а для рабочых-тэкстыльшчыкаў—пасьля 1-га сьнежня 1927 г. Пэнсію атрымаюць мужчыны, якім мінула 60 год з моманту ўходу з работы, калі яны прапрацавалі па найме ня менш 25 год, а жанчыны ва ўзросьце 55 год, калі яны працавалі ня менш 20 год. Пэнсія назначаецца ў палавінным разьмеры ранейшага заработку пэнсіянэра.

Пабудова клюбу харчавікоў у Менску

На рагу Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай вуліц будуецца вялікі клюб для рабочых харчавікоў Менску. Будынак клюбу будзе двухпавярховы. Зала для гледачоў разьлічана на 600 чал. Клюб будзе мець асобныя пакоі для ўсіх гурткоў, вялікую чытальню, бібліятэку і г. д. Акрамя таго, пры клюбе будзе абсталявана спэцыяльная спартыўная зала. Пабудова клюбу будзе каштаваць 340 тыс. руб. Скончэньне пабудовы мяркуецца да 1-га студзеня 1930 году.

„Зьвязда" дапамагла

У лісьце селькора **«Сямейка Копысьскага РВК абрастае сваімі людзьмі»** пісалася аб цэлым радзе непарадкаў у Копыськім РВК, у якіх вінаваты некаторыя працаўнікі РВК. Так, незаконна быў зволены з працы працаўнік райстрахагенства т. Шварц, выклік на фракцыю КП(б)Б РВК т. Гурэвіча, як прадстаўніка рэдкалегіі, якому было прапанавана ўсе заметкі, якія датычаць адказных працаўнікоў, наперад узгадняць з адпаведнымі парторганамі. Грубыя адносіны працаўніка РВК Белавусава да наведальнікаў, парушэньне Белавусавым бюджэтнай дысцыпліны, рэалізацыя камунальнай маемасьці прыватным гандляром і г. д.

Усе паказаныя факты расьсьледваньнем Аршанскай АКК-РСІ пацьвердзіліся.

Пастановай калегіі справа аб зажыме рабкораўскай крытыкі з боку Белавусава перадаецца ў партгройку, а справа аб няправільнай рэалізацыі камунальнай маемасьці перадаецца пракурору для прыцягненьня Белавусава да адказнасьці.

Пажарны райінструктар Розін, як п'яніца і растратчык, звальняецца з працы.

—НЕ ХАЦЕЛІ ІСЬЦІ Ў КАЛГАС члены партыі Калтовіч і Гарасін (Чэрвеньскі раён). І дзіва няма: яны абодва маюць кулацкія гаспадаркі, у партыю пралезьлі праз ашуканства, каб скарыстаць партбілет у шкурных мэтах. Пяпер яны выключаны з партыі, як чужы элемэнт. Справа выкрыта заметкай «Падкулачнікі з партбілетамі агітуюць супроць калгасаў» («Зьвязда» № 113).

Да Кастрычнікавай рэвалюцыі выяўленчае мастацтва на Беларусі ня мела свайго ўласнага нацыянальнага твару. Палітыка жорсткай русыфікацыі, якая праводзілася царскім урадам, не давала магчымасьці разьвівацца беларускаму мастацтву. З прычыны эканамічнай адсталасьці Беларусі і адсутнасьці ў ёй сваіх буйных культурных цэнтраў, масткі беларускага пахаджэньня вымушаны былі ў старыя часы ехаць вучыцца ў вялікія расійскія гарады, атрымлівалі там асьвету, заставаліся там жыць і за нязначнымі выключэньнямі канчаткова парывалі сувязь са сваёй краінай.

Толькі пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі, якая дала магчымасьць вольна разьвівацца нацыянальнай культуры, пачынаецца спачатку ажыўленьне, а потым і хуткі ўздым мастацкага жыцьця на тэрыторыі БССР. Зараз беларускае выяўленчае мастацтва пачынае займаць належнае месца сярод іншых нацыянальных галін агульна-савецкай мастацкай культуры.

Адназ з праяў разьвіцьця выяўленчага мастацтва ў БССР зьяўляецца больш чым 6-цігадовае існаваньне ў Віцебску Беларускага Дзяржаўнага мастацкага тэхнікуму, які прадстаўляе сабой зараз адзіную беларускую навучальную ўстанову ў галіне выяўленчага мастацтва.

Яшчэ ў 1917 г. у Віцебску ствараецца народная мастацкая школа, якая хутка рэарганізуецца ў мастацка-практычны інстытут на чале са славутым мастаком М. Дабужынскім. У рабоце інстытуту прымаюць удзел Марк Шагал, Малевіч, Юдовін, Пэн і інш. У зьвязку з пашырэньнем БССР, інстытут рэарганізуецца ў 1923 г. у Бел. дзяржаўны мастацкі тэхнікум, які існуе да гэтага часу.

У 1925 г. тэхнікум прымае ўдзел у сусьветнай частаўкі выстаўцы ў Парыжы, у 1926 годзе на першай усебеларускай выстаўцы ў Менску, у 1927 г. на выстаўцы нацыянальнасьцяй СССР у Маскве, у 1928-29 г. на ўсебеларускіх выстаўках у Менску. Акрамя таго ён наладжвае на працягу гэтага часу тры ўласныя справаздачныя выстаўкі ў Віцебску.

Аб колькасным росьце тэхнікуму сьведчаць наступныя лічбы: студэнтаў у тэхнікуме было ў 1923-24 г.—41 чал., 1924-25 г.—58 чал., 1925-26 г.—78 чал., 1926-27 г.—102 чал., 1928-29 г.—136 чал.

У гэтым годзе тэхнікум выпускае 18 маляроў, 2 разьбяроў і 2-х дэкаратараў. Прыём на наступны навучальны год вызначаны ў 50 чал. Павялічваецца ўзровень акадэмічнае працы. Зараз тэхнікум выклікаў на спаборніцтвы Пензенскі (РСФСР) і Харкаўскі (УССР) мастацкія тэхнікумы.

Да гэтага часу тэхнікум складаўся з 3-х аддзелаў малярскага, разьбярнага і ганчарна-керамічнага, прычым першыя два аддзелы мелі акадэмічны ўхіл і



падрыхтоўвалі, галоўным чынам, вышэйшай мастацкай асьветы.

Зараз-жа мяркуецца надаць тэхніку мастацка-вытворчы напрамак. Згоду на праекту рэарганізацыі, які распрацаваны дырэкцыяй, тэхнікум павінен складацца з наступных аддзелаў:

1. Мастацка-педагагічнага з выкладаньнем малярства і лепкі.
2. Ганчарна-керамічны.

Акрамя таго павінны з 3-га курсу быць уведзены 2 майстэрні: дэкаратарна-бутафорская і паліграфічная.

Згодна гэтага праекту мэтавая ўстаноўка тэхнікуму будзе заключацца ў падрыхтоўцы:

1. Выкладчыка выяўленчага мастацтва для пачатковых і сярэдніх навучальных устаноў і для мастацкіх гурткоў пры клюбах.
2. Мастака-інструктара для ганчарна-керамічнай прамысловасьці.
3. Мастака-графіка ў галіне паліграфічнай прамысловасьці (вядома кніжных выданьняў, ілюстрацыя, плякаты і г. д.).
4. Дэкаратара-бутафора для патрэбаў тэатраў, кіно-прамысловасьці і клюбаў.

Апрача таго прапануецца ўвесьці ў складаньне яўрэйскага мастацтва для работы на яўрэйскай мове.

Пры ўмове ажыцьцяўленьня гэтага рэарганізацыі, забесьпячэньня тэхнікуму ў першую чаргу належным памяшканьнем, а таксама пры ўмове выканай зацікаўленасьці і ўвагі да яго з боку адпаведных устаноў (да гэтага часу яны былі нездавальняючымі), Беларуская дзяржаўны мастацкі тэхнікум цвердо апраўдае сваё існаваньне: будзе давать дзяржаве тэхнікаў-спэцыялістых выяўленчага мастацтва, якія адпавядаюць задачам сацыялістычнага будаўніцтва, зоймуць пачэснае месца ў справе стварэньня беларускай культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

В. ВОЛЬСКІ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Усе цесьляры павінны зьявіцца на біржу працы ў сэкцыю будаўнікоў ня пазьней 3/6 для пасылкі на працу.

Цесьляры (сезоньнікі), якія ня зьявяцца, будуць зьняты з вучоту біржы.

— КАМВУЗ. У нядзелю 2-VI 29 г., а 6 г. ув., у памяшканьні камунівэрсытэту адчыняецца канфэрэнцыя былых студэнтаў Камвузу, на якую запрашаюцца, апрача дэлегатаў, і ўсе былыя студэнты камунівэрсытэту, што працуюць цяпер у розных установах г. Менску. Парадак дня канфэрэнцыі: 1. Палітычны даклад. 2. Аб рабоце КУБ і напрамку яго далейшай дзейнасьці. 3. Аб формах сувязі і дапамогі ў далейшым павышэньні тэаратычнага ўзроўню скончыўшых камвуз.

— БДУ. Сёньня, у суботу, 1 чэрвеня, роўна а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні 41-ай аўдыт. адбудзецца агульны сход выпускнікоў Праўгасу, які абавязкова без спазьненьня.

— Дом Асьветы. У нядзелю, 2 чэрвеня, а 11 гадзіне дня ў Доме Працаўнікоў Асьветы адбудзецца канфэрэнцыя краязнаўчых гурткоў Менскіх гарадзкіх школ.

Для ўдзелу ў канфэрэнцыі просьба вылучыць ад кожнай школы 3-5 представаўнікоў пры 1 настаўніку.

— Клюб «Саўгандальслужачых». 2 і 3 чэрвеня ў клюбе адбудуцца спэктаклі тэатру б. Корш; з удзелам заслуж. арт. Радзіна і Шатровай, пастаўлена будзе п'еса «Ложь».

Білеты ў касе клюбу ад 6—10 гадзін увеч.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Нядзеля, 2 чэрвеня, адкрыты спэктакль, перанесены з 30 мая
ІНГА
Сучасная п'еса ў 4 дзеях., 12 абразох.
Пачатак а 8 гадз. увечары

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»
Гастролі артыстых Масноўскага тэатру б. КОРША заслуж. арт. рэспублікі Н. М. РАДЗІНА І Е. М. ШАТРОВАЙ.
Суббота, 1 чэрвеня **„ЛОЖЬ"** (ЛАМБЕРТЬЕ) у 3-х дзеях. твор Вэрнэйль.
Білеты ў касе тэатру „Прафінтэрн". Пачатак гадз. 6а увеч

Клюб „САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫ"
Нядзеля, 2 чэрвеня — Спэктаклі тэатру **б. КОРШ** з удзелам РАДЗІНА І ШАТРОВАЙ. — Панядзелак, 3 чэрвеня
Астача білетаў у касе клюбу ад 6—10 г. увеч. — пастаўлена будзе п'еса **„ЛОЖЬ"** — Пачатак спэктаклей а 9 гадз. увеч.

Цэнтр. Кіраўніцтва Дзяржцыркамі
АДЧЫНЕНЬНЕ ДЗЯРЖЦЫРКУ
6 чэрвеня
ЧЫТАЙЦЕ РЭКЛЯМУ!

КІНО-ТЭАТР **„Культура"** — Ад аўторка 28 мая — мастацкі фільм **ПАМЫЛКА „генэрала" СТРЭХІ** Весёлая камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы—Кіно-хроніка „Совкино" № 15.
Кіно-сад **ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА** Савецкая, 71. — 2-гі тыдзень! Ад аўторка 28 мая з прычыны яклінага посьпеху **ЧАНГ** (Жахі джунгляй) Пачатак сэансаў—а 9 г і 10 г. 30 м.
КІНО **Інтэрнацыянал** — Ад аўторка, 28 мая — мастацкі фільм **СЭРЦА і ДАЛЯРЫ** Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 з пал. гадз.
КІНО **Пралетарый** — Ад аўторка, 28 мая **КАХАНЬНЕ Ў ПРЫРОДЗЕ** Пачатак—а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г.
КІНО **СПАРТАК** — Баяніі! Баяніі! **ЛЯСНЫ ЗЬВЯР** кіно-раман у 9 част. У гал. ролях: А. І. Салтыкоў, Панаў і А. Е. Юрэневу. Каса—ад 6 г. Пачатак 1 с. а 7 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Усебеларуская кантора Дзяржбанку
на падставе § 9 правіл па выдачы пазычак пад заклад аблігацый дзяржаўных пазык
АБВЯШЧАЕ,
што ва ўсіх установах Дзяржбанку, ашчадных касах і іншых крэдытных установах устанаўляюцца наступныя процантныя стаўкі па аперацыях выдачы пазычак пад аблігацыі дзярж. пазык:
На пазычках пад абл. 6 проц. Дзярж. ун. паз. 1922 г.—12 прац. гадав. плюс 1/5 проц. штомес. камісіі
" " " " 10 проц. " " " 1927 г.—10 проц. " " 1/4 проц. " "
" " " " 1-й Пазыкі Індустрыялізацыі нар. гасп. — 12 проц. гадавых.
" " " " 2-й " " " " "
" " " " Пазыкі Узмацненьня Сялянск. гасп.
Пазычкі пад усе вышэйпаказаныя пазыкі ўсімі ўстановамі Дзяржбанку, касамі ашчаднасьці і іншымі крэдытнымі ўстановамі выдаюцца ў разьмеры 60 проц. намінальнага кошту аблігацый.

На чэрвень і да канца году. **Пасьпяшэцеся СЕНЬНЯ-Ж падпісацца НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА** На чэрвень і да канца году.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску—У галоўнай канторы газэты «Зьвязда»—Савецкая, 63, 3-ці паверх, штодзенна ад 9—5 г., упоўнаважанымі галоўнай канторы.
У провінцыі:—Аддзяленьнямі БДВ, аддзяленьнямі выдавецтва „Известия" і „Правда", кіёскамі кантраг. друку і ўсімі пашт.-тэл. кан-мі.

ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ САВЕЦКАЙ КНІГІ
Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам і Аддзяленьнем „ГИЗ'а РСФСР" у Менску
АДЧЫНЕНА ВЫСТАЎКА
САВЕЦКІХ КНІГ, ГАЗЭТ і ПЭРЫОДЫКІ
на беларускай, расійскай, яўрэйскай, польскай, латыскай, літоўскай і украінскай мовах.
Выстаўка зачыняецца ў нядзелю, 2 чэрвеня.
Выстаўка адчынена ў працоўныя дні з 6 да 9 гадзіны ўвечары, а ў дні адпачынку з 1 гадзіны дня да 7 гадзіны ўвечары.
УВАХОД для ўсіх БЕСПЛАТНЫ.
Наведвальнікам групаю даюцца тлумачэньні аб савецкім друку.
Выстаўка зьмяшчаецца ў памяшканьні Камвузу па Унівэрсытэцкай вул., № 27.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА і Бел. аддзяленьне «ГИЗ'а РСФСР»

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ Натуральныя Мінэральныя Воды **НАРЗАН**
ЭСЕНТУКІ № 20 Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОЎСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | БАРНОМ
Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах з дарожнай дастаўкай на дом.
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.
Патрабуйце ўсюды каўкаскія натуральныя мінэральныя воды!
Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.
Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.
НАРЗАН — ЭСЕНТУКІ № 20.

КРЕМ МЕТАМОРФОЗА ЛУЧШЕЕ ИСПЫТАННОЕ СРЕДСТВО ПРОТИВ ВЕСНУШЕК, КРАСНОТЫ, ЖЕЛТЫХ ПЯТЕН, ЗАГАРА, УГРЕЙ И ДР. НЕДОСТАТКОВ КОЖИ ЛИЦА. **КАЗИМИ**

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3-ЦІ ПАВЕРХ.
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЗМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭННІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Коштпублікацыі 50 к. аб згубе дакуманту

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы
лічыць несапраўднымі

Асабов. пасьведчаньне Гаўсман Ф. О., выд. праўленьнем БДУ 1784
Асабов. пасьведчаньне № 31, Папяскуа М. Ф., выд. к-рай матар'яльн. службы МБВ чыг. 1785
Асабов. пасьведчаньне Маладая А. І., выд. Заречынскім с-с, Плешчаніц. р-ну 1786
Пашпарт Блецько С. К., выд. Менскай міліцыяй 1787

Членская кніжка Дзядулькі выд. саюзам шэвэнікаў
Кандыдацкая картка № Гарбаленя Г. Н., выд. К-кай арганізацыяй КП(б)Б

Здаецца ДАЧА (асобны домік) каля сасновага лесу ст. Ратамка, Зах. чыг. дом Бабена.

БУМАГУ для МУХ выраб. кустарная мастэрня Бр. ДИНЕРШТЕЙН Менск, Комсомольская, во дворе.

Друкарня газэты «Зьвязда». Менск

Менск Галоўлітбел № 696.